Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

6 СНЕЖНЯ 2007 г.
ЧАЦВЕР
№ 232 (26097)
Кошт 380 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВЫ ГОД

Пачалася падпіска на і квартал і І паўгоддзе 2008 года.
Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс	на 1 месяц	на 3 месяцы	на 6 месяцаў
63850 (індывідуальны)	8800	26400	52800
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	8300	24900	49800
63858 (ведамасны)	14000	42000	84000
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	12800	38400	76800

ПАДПІСКА НА І КВАРТАЛ І І ПАЎГОДДЗЕ 2008 ГОДА.
ПАДПІСНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»
«Да запатрабавання» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку)

63850 (індывідуальны)	7460	22380	44760
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	6990	20970	41940
63858 (ведамасны)	9938	29814	59628
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	9431	28293	56586

Грамадзянам кампенсуюць кошт уласнага жылля, перададзенага дзяржаве ўзамен службовага

У Беларусі кампенсуюць кошт жылля, якое належала грамадзянам або членам іх сем'яў, і перададзенага на бязвыплатнай аснове дзяржаве пры набыцці імі ва ўласнасць службовага жылога памяшкання. Гэта значыць, з належнага да выплаты кошту службовага жылога памяшкання, якое атрымліваецца ва ўласнасць, будзе вылічаны кошт жылога памяшкання, бязвыплатна перададзенага грамадзянамі. Такая норма змешчана ва Указе Прэзідэнта Беларусі № 612 ад 4 снежня.

Дакументам канкрэтызаваны выпадкі і правілы атрымання ва ўласнасць на бязвыплатнай аснове службовых жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду, што да 1 студзеня 2008 года дазволена некаторым катэгорыям грамадзян.

Пры наяўнасці роўных умоў устаноўлены роўныя правы на атрыманне службовага жылля ва ўласнасць як для наймальнікаў гэтых памяшканняў, звольненых з арганізацыі, што прадаставіла службовае жыллё, так і для наймальнікаў, якія прадаўжаюць працаваць у гэтай арганізацыі. Роўныя правы прадастаўлены таксама членам сям'і памерлага наймальніка службовага жылога памяшкання (грамадзянскай асобы), якія маюць такое права на падставе Указа № 128 ад 19 сакавіка 2007 года, і членам сям'і ваеннаслужачага не толькі загінулага, але і памерлага.

Пры гэтым забаронена перадача ва ўласнасць грамадзянам службовых жылых памяшканняў у будынках, выдзеленых для размяшчэння органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, на тэрыторыі нацыянальных паркаў і запаведнікаў, у жылых дамах, размешчаных на зямельных участках, прадастаўленых Галоўнаму ўпраўленню па абслугоўванню дыпламатычнага корпуса і афіцыйных дэлегацый «Дыпсэрвіс». Гэта датычыцца і службовага жылля, якое знаходзіцца ў веданні галоўнага ўпраўлення камандуючага ўнутранымі войскамі Міністэрства ўнутраных спраў, у санаторыі Камітэта дзяржаўнай бяспекі, а таксама пабудаванага за кошт сродкаў інвестыцыйнай праграмы.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вёска Рог Салігорскага раёна. Пенсіянеры Васіль Ільюшчыц і Васіль Каваленя любяць пацешыцца народнай музыкай.

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ПАВІНШАВАЎ УЛАДЗІМІРА ПУЦІНА З ПЕРАМОГАЙ ПАРТЫІ «АДЗІНАЯ РАСІЯ» НА ВЫБАРАХ У ДЗЯРЖДУМУ

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна з перамогай партыі «Адзіная Расія» на выбарах у Дзярждуму.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

КАРУПЦЫЙНЫ РЭСУРС

Супрацоўнікі вайсковай контрразведкі вывелі на чыстую ваду дырэктара рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белдаррэсурсы».

Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-групе ўпраўлення вайсковай контрразведкі КДБ, памянёны кіраўнік падазраецца ў хабарніцтве, злоўжыванні службовым становішчам і іншых махінацыях. У прыватнасці, дырэктар заключаў кантракты з камерцыйнымі фірмамі на набыццё і пастаўку матэрыялаў толькі пры ўмове, калі камерсанты яго асабіста зацікавяць саліднай сумай грошай. Падчас атрымання такога «адкату» ў памеры 11 тысяч долараў чэкісты і арыштавалі хабарніка. У карупцыйным бізнэсе была і дачка дырэктара. На яе была зарэгістравана фірма-пастаўшчык матэрыялаў. У штаце гэтага прадпрыемства было больш за 20 супрацоўнікаў. Насамрэч гэта былі «мёртвыя душы». Праўда, заробак ім налічваўся рэальнымі грашовымі знакамі.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ЖОНКА З НАЖОМ СУПРАЦЬ МУЖА З НАЖОМ: НІЧЫЯ — ДВА РАНЕННІ І ДЗВЕ БАЛЬНІЦЫ

У розныя бальніцы сталіцы позна ўвечары трапілі з адной кватэры муж з жонкай, якія перад гэтым нежартоўна схліснуліся ў спрэчцы.

Як паведамілі нашай газеце ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, 41-гадовая жанчына і яе 48-гадовы муж каля васьмі гадзін вечара чагосьці не паладзілі, пасля чаго высвятлялі адносіны ўжо з халоднай зброяй у руках. Б'ючы адно аднаго, яны «даразбіраліся» да таго, што атрымалі па нажавому раненню: жанчына — у жывот, мужчына — у грудзі. Між іншым, Першамайскім РУУС узбуджаны крымінальныя справы ў дачыненні як мужчыны, так і жанчыны.

Ігар ГРЫШЫН.

БЕЛАРУСЫ, ЯКІЯ ЧАКАЛІ КАНЦА СВЕТУ Ў ПЕНЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ, ВЫСЛАНЫ НА РАДЗІМУ

Шэсць грамадзян Беларусі, якія чакалі канца свету ў закінутым доме ў вёсцы Нікольскае Бекаўскага раёна Пензенскай вобласці, высланы на радзіму. Такое рашэнне прыняў суд Пензы на падставе адсутнасці ў іх рэгістрацыі па месцы знаходжання.

Паводле даных праваахоўных органаў, беларускія грамадзяне, у ліку якіх трое непаўналетніх дзяцей, ужо перасеклі граніцу Беларусі. Усе яны з'яўляюцца жыхарамі Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці.

БЕЛТА.

НАБЛІЖАЮЦЦА «СУДНЫЯ ДНІ» БАРОЎСКАГА

Экс-кіраўнік «Белнафтахіма» Аляксандр Бароўскі хутка апынецца на лаве падсудных.

Як паведаміла прэс-сакратар Вярхоўнага Суда Настасся Цымановіч, справа колішняга генеральнага дырэктара канцэрна ўжо знаходзіцца ў вышэйшай судовай інстанцыі краіны. Дата пачатку працэсу яшчэ не прызначана. Пакуль што ў Вярхоўным Судзе вывучаюцца матэрыялы справы, якую расследавала Генеральная пракуратура. Як раней адзначаў Генеральны пракурор краіны, былы кіраўнік «Белнафтахіма» падазраецца ў нанясенні інтарэсам дзяржавы шкоды ў памеры 1,6 млн долараў. Уся незаконная дзейнасць колішняга кіраўніка канцэрна была звязана з пастаўкамі расійскіх нафтапрадуктаў і іх рэалізацыяй.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Дэбюракратызацыя

СА ЗВАРОТАМІ ГРАМАДЗЯН БУДУЦЬ ПРАЦАВАЦЬ ПА-НОВАМУ

Асновай дзяржаўнай палітыкі, якая праводзілася і праводзіцца ў Беларусі, заўсёды з'яўляўся і з'яўляецца чалавек. І нездарма Канстытуцыя абвясціла нашу дзяржаву не проста дэмакратычнай, не проста прававой, а сацыяльнай. Пра гэта заявіла намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Наталля Пяткевіч, адкрываючы семінар кіруючых работнікаў рэспубліканскіх і мясцовых дзяржаўных органаў.

Для людзей у нашай дзяржаве зроблена вельмі многа, яшчэ больш робіцца і будзе рабіцца.

«Сёння ўжо мала гаварыць проста пра павышэнне ўзроўню жыцця: задача стаіць больш патрабавальная — паляпшэнне якасці жыцця людзей, — заявіла Наталля Пяткевіч. — Аднак усе гэтыя намаганні дзяржавы будуць дарэмнымі, калі чалавек, каб вырашыць сваю няхай і маленькую праблему, будзе сутыкацца з неабходнасцю прайсці мноства кабінетаў і атрымаць велізарную колькасць усемагчымых даведак, ці атрымае фармальную адпіску на набалелае пытанне».

Менавіта таму сёння ў краіне ўзяты курс на бескампрамісную і вельмі прынцыповую барацьбу з бюракратызмам. На гэта накіравана Дырэктыва Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 2. Паводле слоў намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, дэбюракратызацыя павінна прайсці па двух накірунках: адносінаў паміж дзяржавай і чалавекам і дзяржаўнага апарату ўнутры сябе.

Сёння пытанне аб пабудове сацыяльнай дзяржавы гучыць па-новаму. Прэзідэнтам абвешчана пабудова дзяржавы для народа. І калі ўдумацца, на самай справе гэта задача не такая складаная ў рэалізацыі: дастаткова, каб кожны чалавек на сваім працоўным месцы добрасумленна і прафесійна выконваў свае абавязкі. Бо бюракратызм — гэта не толькі тое, з чым можна сутыкнуцца ў кабінетах чыноўнікаў, але і несвоечасовае адкрыццё крамы ці прыёмнага пункта, няветлівае абслугоўванне ў цырульні ці паліклініцы... Калі ж чалавек прыходзіць у кабінет да чыноўніка дзяржаўнай арганізацыі, апошні павінен унікнуць у яго праблему, разабрацца, даць прафесійны адказ, зрабіць усё, каб задаволіць правы і законныя інтарэсы грамадзяніна. Менавіта на гэта накіраваны Указ кіраўніка дзяржавы «Аб дадатковых мерах па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асобаў», які ўступіць у сілу 15 студзеня 2008 года.

Як паведаміла Наталля Пяткевіч, асноўная прычына з'яўлення гэтага дакумента — дысбаланс у іерархіі разгляду зваротаў грамадзян. Да Прэзідэнта за год паступае звыш 30 тысяч зваротаў, 70 працэнтаў з якіх не толькі маглі, але і павінны былі вырашацца на нізавым узроўні. Парадокс у тым, што ў вельмі вялікай колькасці выпадкаў, калі гэтыя звароты на гэты ўзровень спускаюцца «зверху», аказваецца, што грамадзянін сапраўды меў рацыю. Менавіта таму новы Указ скіроўвае мясцовых чыноўнікаў на тое, каб усе звароты разглядаліся па сутнасці і пры наяўнасці падстаў задавальняліся, а не накіроўваліся ад інстанцыі да інстанцыі. Адказнасць за парушэнне такога падыходу будзе самая строгая.

Пацвярджэннем таму, што Указ Прэзідэнта быў неабходны і з'явіўся своечасова, стала і выступленне намесніка старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Раісы Саўрыцкай. Пералік парушэнняў у рабоце са зваротамі грамадзян у самых розных рэгіёнах і на самым розным узроўні заняў не адну хвіліну. Усяго ж у Беларусі ў 2007 годзе да дысцыплінарнай, адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці былі прыцягнуты 2460 дзяржслужачых, у тым ліку чатыры міністры і адзін старшыня канцэрна, 61 чыноўнік вызвалены ад займаемай пасады.

Паводле слоў начальніка Галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва Міністэрства юстыцыі Алы Бодак, Указ Прэзідэнта «Аб дадатковых мерах па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асобаў» уводзіць дакладны прынцып першачарговасці разгляду зваротаў, якія паступаюць у дзяржорганы. Нарматыўным актам вызначаецца паслядоўнасць разгляду зваротаў у парадку дакладнай іерархіі. Заяўніку, які не задаволены адказам установы, даецца права абскардзіць яго ў вышэйшым органе ўлады, а пасля гэтага ў судзе. У адпаведнасці з указам, калі зварот знаходзіцца не ў кампетэнцыі таго органа, у які ён паступіў, то ўстанова абавязана ў пяцідзённы тэрмін накіраваць арыгінал звароту ў кампетэнтны орган і паведаміць аб гэтым заяўніку.

Указам таксама ўзмоцнена адказнасць службовых асобаў за некарэктны і несвоечасовы разгляд зваротаў. У прыватнасці, узмоцнены парадак прымянення да чыноўнікаў мераў дысцыплінарнай адказнасці.

На завяршэнне трэба адзначыць, што семінар не ператварыўся ў чарговую тэарэтычную лекцыю, а атрымаўся сапраўды рабочым. Кіруючыя работнікі, якія адказваюць за работу са зваротамі грамадзян на самых розных узроўнях, атрымалі адказы на многія пытанні, што іх хвалявалі, і змогуць больш кваліфікавана працаваць у новых умовах.

Сяргей ПРОТАС.

Рынак працы

МІНСК ДАЕ «ЗЯЛЁНАЕ СВЯТЛО»?

Спрашчэнне ўмоў працаўладкавання іншагародніх грамадзян у сувязі са скасаваннем прапіскі і ўвядзеннем рэгістрацыі не павінна прывесці да напружанасці на рынку працы сталіцы. У прыватнасці, як зазначыў падчас сустрэчы з журналістамі начальнік упраўлення занятасці Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Чэслаў Роўба, тут можна ўзгадаць, прынамсі, дзве прычыны — паступовае змяншэнне колькасці працаздольнай моладзі, а таксама значнае перавышэнне колькасці вакансій над колькасцю беспрацоўных у буйнейшым горадзе Беларусі.

У пачатку лістапада на 3,6 тыс. беспрацоўных сталіцы прыпадала адразу 20,2 тыс. заявак наймальнікаў. Праўда, варта адразу заўважыць, што больш чым 80 працэнтаў вакансій былі разлічаны на рабочыя спецыяльнасці. Паводле слоў Чэслава Роўбы, Мінск адчувае востры недахват вадзіцеляў аўтамабіляў, зваршчыкаў, электрыкаў, слесараў, мантажнікаў, токараў, повараў, гандляроў харчовых тавараў, апроч таго, існуе традыцыйна высокі попыт на сярэдні медыцынскі персанал, урачоў-тэрапеўтаў, фармацэўтаў, інжынераў асобных кваліфікацый, кіраўнікоў сярэдняга звяна — загадчыкаў структурных падраздзяленняў, майстроў, прарабаў.

Адным са шляхоў ліквідацыі гэтага дэфіцыту называецца спрашчэнне ўмоў працаўладкавання ў сталіцы іншагародніх грамадзян. З 1 студзеня як у жыхароў прылеглых раёнаў, так і ў жыхароў больш аддаленых рэгіёнаў, ужо не будзе неабходнасці турбавацца аб спецыяльных дазволах Мінгарвыканкама. Праўда, усім, хто хоча працаваць у Мінску, давядзецца вырашыць праблему з рэгістрацыяй.

Першы і найбольш аптымальны варыянт у дадзеным выпадку — атрыманне пастаяннай рэгістрацыі. Для гэтага самі грамадзяне ці арганізацыя, якая запрашае іх на работу, павінны знайсці ў Мінску па 20 квадратных метраў агульнай жылплошчы ў дамах ці кватэрах ці па 6 «квадратаў» у інтэрнатах у разліку на аднаго чалавека.

Другім варыянтам працаўладкавання стане атрыманне часовай рэгістрацыі. Яе канчатковы парадак пакуль не вызначаны, аднак мяркуецца, што «на часовых умовах» можна будзе зарэгістравацца без уліку метраў жылплошчы ў кватэрах ці дамах, або ў іншых збудаваннях, якія маюць тэхпашпарт, — скажам, у садовых доміках. Дзеля справядлівасці, нельга не адзначыць, што менавіта гэты шлях прынясе і шэраг дадатковых праблем. Працэдуру часовай рэгістрацыі давядзецца паўтараць штогод, і да таго ж у такім выпадку могуць узнікнуць пэўныя пытанні з прадастаўленнем медыцынскіх і іншых сацыяльных паслуг.

Пры гэтым, паведаміў Чэслаў Роўба, у бліжэйшы час плануецца наладзіць пастаянную перадачу інфармацыі аб мінскіх вакансіях у раённыя службы занятасці. Апроч таго, вывучыць попыт наймальнікаў сталіцы магчыма на сайце www. minsk.gov.by/rabota. І на тым жа сайце кожны, хто хоча працаваць у Мінску, можа пакінуць сваю анкету.

Сяргей ГРЫБ.

Кошт арэнды жылля ў прыгарадзе Мінска даганяе сталічны цэннік

Здам — зніму

Днямі ў рэдакцыю нашага выдання звярнуўся жыхар Оршы Кірыл Загібнік, які атрымаў нядрэнную працу ў сталіцы. Аднак добрая праца — гэта толькі палова справы, бо зараз трэба знайсці якое-небудзь прывабнае жыллё, каб перавезці сюды жонку і дачку. Наш чытач ведае, колькі каштуе арэнда кватэр у сталіцы і разумее, што гэты цэннік яму не зусім па кішэні, аднак... Справа ў тым, што спадар Загібнік не прэтэндуе жыць непасрэдна ў Мінску і згодны здымаць кватэру ў невялікім населеным пункце побач са сталіцай. Малады чалавек папрасіў нас дапамагчы яму адшукаць такое жыллё.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Катэджы і домікі на суткі

Пошукам памяшканняў для здачы жылля іншагароднім жыхарам для доўгатэрміновага пражывання сур'ёзна займаецца толькі некалькі сталічных агенцтваў нерухомасці. Галоўным чынам спецыялісты паважных агенцтваў прапануюць сваім кліентам у прыгараднай зоне Мінска ўтульныя домікі і шыкоўныя катэджы на суткі ці на выхадныя выключна для адпачынку. Так, адпачынак у катэджах з лазняй побач з пасёлкамі Сокал ці Бальшавік будзе каштаваць не менш як 70—80 долараў у суткі. Магчыма адшукаць невялікі домік і за 50 долараў за суткі, але такі заказ трэба ўжо браніраваць мінімум за тыдзень. Вядома, што па такім кошце ў катэджах адпачываюць зусім не бедныя людзі.

Прыгарад даражэе з вясны

Спецыяліст па арэндзе аднаго са сталічных агенцтваў нерухомасці спадарыня Марыя паведаміла нам, што іншагародняя работнікі мінскіх арганізацый займаюцца актыўным пошукам жылля ў прыгарадных населеных пунктах галоўнага мегаполіса ўжо на працягу некалькіх гадоў, але менавіта ў апошні час на гэтым сегменце рынку назіраецца сапраўдны бум павышанага попыту.

Агенцтва нашай суразмоўцы прымае заяўкі на здыманне кватэр, домікаў, часткі домікаў з асобным уваходам у такіх гарадках і пасёлках вакол Мінска, як Бараўляны, Заслаўе, Гатава, Калодзішчы, Слабада, Ждановічы, Сокал, Мачулішчы, Бальшавік, Лясны, Тарасава і г.д.

Зараз у гэтых населеных пунктах арэнда аднапакаёвых кватэр дасягнула цэнніка ў памеры 180—200 долараў плюс аплата камунальных паслуг. У Заслаўі і Калодзішчах уласнікі аднапакаёвак пачынаюць прапаноўваць сваё якаснае жыллё ўжо за 230—250 долараў. Разам з тым кліенты з уласнымі аўтамабілямі часам згаджаюцца здымаць кватэры ў невялікіх гарадках адлегласцю 20 кіламетраў і больш ад Мінска. Такія кватэры прапануюцца ўжо таксама не вельмі танна — каля 140—150 долараў.

Кошт паслуг агенцтваў нерухомасці па пошуку жылля ў прыгараднай зоне Мінска крыху адрозніваецца ад сталічных тарыфаў. Такі дагавор з агенцтвам каштуе 110 тысяч рублёў, а дзейнічае ён на працягу ўсяго тэрміну пошуку неабходнай кліенту кватэры аж да засялення.

Спадарыня Марыя адзначае, што асобныя іх кліенты могуць чакаць сваіх танных варыянтаў нават па некалькі месяцаў. Тыдзень таму адзін іх упарты кліент зняў адпаведную кватэру з мэбляй і тэлефонам на трэцім паверсе пяціпавярховага дома ў Гатаве ўсяго за 100 долараў. Другому кватаранту пашанцавала з двухпакаёвай кватэрай, якую ён зараз арандуе ў Ждановічах за 240 долараў. Імгненна адшукаўся кліент на арэнду паловы жылога дома на другім паверсе з усімі выгодамі і нядрэнай мэбляй у пасёлку Тарасава за 170 долараў. Аднапакаёвая кватэра побач з прыпыначным пунктам электрычак у Пухавічах за 100 долараў у месяц затрымалася ў агенцтве толькі 3 дні.

Паслугі агенцтваў прадугледжваюць толькі пошук адпаведных варыянтаў для кліентаў, а будучыя наймальнікі ўжо самастойна дамаўляюцца з гаспадарамі жылля. Між іншым, у агенцтве бакам прапануюць узор дагавора, які афармляецца галоўным чынам выключна паміж кватарантамі і ўласнікамі жылля, дзе могуць агаворвацца як спецыфічныя, так і агульнавядомыя ўмовы часовага пражывання.

Можна адшукаць танней

Вышэйагучаныя цэны арэнды жылля ў прыгараднай зоне сталіцы існуюць для тых, у каго няма часу, жадання, ці ўвогуле ніякіх здольнасцяў шукаць кватэру самастойна. Пустое жыллё ў невялікіх гарадках і пасёлках каля сталіцы існуе і зараз, упэўнена мая знаёмая, якая «выбіла» сабе пакой у інтэрнаце Бараўлян, — яго трэба толькі знайсці. Інфармацыю аб магчымай здачы кватэр можна адшукаць у агульным аддзеле навучальных устаноў гарадка, у ЖЭСе, а таксама ў жыллёвым аддзеле мясцовага райвыканкама ці гарвыканкама. Самым старым метадам пошуку кватэр застаецца расклеванне аб'яў непасрэдна каля шматпавярховых ці асобных жылых дамоў. Мой знаёмы эксперт з Бараўлян лічыць, што сёння рэальна зняць невялікую сярэднюю па якасці аднапакаёўку ў прыгарадзе Мінска не даражэй чым за 100—120 долараў.

Сяргей КУРКАЧ.

Минский городской центр недвижимости

ОАО «ПАРИТЕТБАНК» (ПРОДАВЕЦ)
СОВМЕСТНО С УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
(ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)

повторно проводят
открытый аукцион

по продаже помещений транспортного назначения (машиномест) в подземной гостевой автостоянке, расположенных по адресу:
г. Минск, ул. Гамарника, 9/3.

Номер лота	Номер машиноместа	Общая площадь, кв. м	Начальная цена, бел. рубли	Сумма задатка, бел. рубли
4.	4.	11.9	8 499 992	849 999
5.	5.	11.9	8 499 992	849 999
6.	6.	12.0	8 571 420	857 142
7.	7.	12.0	8 571 420	857 142
8.	9.	12.2	8 714 277	871 428
9.	13.	12.2	8 714 277	871 428
10.	16.	12.5	8 928 563	892 856
11.	17.	12.5	8 928 563	892 856
12.	20.	12.5	8 928 563	892 856
13.	21.	12.5	8 928 563	892 856
14.	22.	12.5	8 928 563	892 856
15.	27.	12.5	8 928 563	892 856
16.	28.	12.5	8 928 563	892 856
17.	29.	11.7	8 357 135	835 714
18.	30.	11.7	8 357 135	835 714
19.	37.	9.6	6 857 136	685 714
20.	38.	9.6	6 857 136	685 714
21.	39.	9.6	6 857 136	685 714
22.	40.	9.6	6 857 136	685 714
23.	41.	9.6	6 857 136	685 714
24.	42.	9.6	6 857 136	685 714
25.	43.	9.6	6 857 136	685 714
26.	44.	9.6	6 857 136	685 714
27.	45.	10.6	7 571 421	757 142
28.	46.	10.2	7 285 707	728 571

Начальная цена каждого лота указана без учета НДС.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены лота перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Договор купли-продажи между продавцом и покупателем подписывается в течение 3 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение 5 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи. Аукцион состоится 19 декабря 2007 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 18 декабря 2007 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Порядок подачи заявлений на участие в аукционе указан в условиях проведения аукциона. Извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 16.11.2007.

Телефоны для справок: 227 48 36, 227 40 22 —
УП «Минский городской центр недвижимости» УНП 190398583

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания КПП № 2 (46 кв.м), расположенного: г. Слуцк, 1-й пер. Железнодорожный, 10. Площадь земельного участка 0,0338 га. Начальная цена снижена на 20 % и составляет — 19 680 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 02.10.2007 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 26.12.2007 г. в 15.00 по адресу: г. Слуцк, ул. Ленина, 120. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 22.12.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактные телефоны: (8017) 224 61 34, (801795) 5 71 33.
Сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

белагропромбанк
традиции будущего

ПОБЕДИТЕЛЬ КОНКУРСА «БРЭНД ГОДА 2006»

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»
сообщает, что 12 декабря 2007 года проводится внеочередное Общее собрание акционеров в заочной форме.
220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.
2. Об утверждении Положения о порядке ведения учета и представления информации об аффилированных лицах ОАО «Белагропромбанк».

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 5 декабря 2007 года.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы и отделения по месту нахождения акционеров.

Бюллетени для заочного голосования заполняются и представляются не позднее 10 декабря т.г.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 21 декабря 2007 года.

Телефоны для справок: 8(017) 250 60 01, 228 53 03.

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 27.10.2007 г. № 2, УНП 100693551

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 06.12.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 153,00
1 еўра	3 168,03
1 латвійскі лат	4 534,06
1 літоўскі літ	917,61
1 чэшская крона	120,47
1 польскі злоты	877,61
1 расійскі рубель	88,15
1 украінская грыўня	425,43

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў
Цэнтрабанк РФ

USD	24,4236
10 UAH	48,1424
1000 BYR	11,3243
EUR	35,9662

Курс у гандлёвых кампаніях (на 05.12.2007 г.)
USD 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісьмецкая на часопіс «Главный бухгалтер. ГЗ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

7 снежня 2007 года у 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) прадоўжыць работу восьмая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

ISSN 1990 - 763X

Беларусь — Сусветны банк: новая стратэгія супрацоўніцтва

Савет дырэктараў Сусветнага банка разгледзеў Стратэгію супрацоўніцтва з Беларуссю на 2008—2011 гады. Сусветны банк мае намер выдзеліць каля 100 млн долараў ЗША на працягу наступных чатырох гадоў у выглядзе доўгатэрміновых пазык. Яны пойдуць на вырашэнне экалагічных праблем глабальнага значэння і задач у сферы энергетыкі, а таксама на павышэнне канкурэнтаздольнасці нацыянальнай эканомікі. Таксама Савет дырэктараў Сусветнага банка адобрыў дадатковае фінансаванне ў памеры 15 млн долараў ЗША на падтрымку праекта мадэрнізацыі інфраструктуры сацыяльнай сферы. Дакладней, на ўдасканаленне санітарна-гігіенічных умоў ва ўстановах сацыяльнага сектара па ўсёй тэрыторыі Беларусі.

Леанід ТУГАРЫН.

Парафіраваны праект пагаднення аб адкрыцці прадстаўніцтва Еўракамісіі ў Беларусі

Парафіраваны праект пагаднення паміж беларускім урадам і Камісіяй Еўрапейскіх супольніцтваў аб заснаванні, прывілеях і імунітэтах прадстаўніцтва Камісіі Еўрапейскіх супольніцтваў у Рэспубліцы Беларусь. Перагаворы па гэтаму дакументу прайшлі 5 снежня ў беларускім знешнепалітычным ведамстве. У іх прынялі ўдзел намеснік міністра замежных спраў рэспублікі Валерый Варанецкі і кіраўнік прадстаўніцтва Еўракамісіі ва Украіне і Беларусі Іен Боўр.

Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе МЗС, у час сустрэчы бакі выходзілі з таго, што адкрыццё прадстаўніцтва Камісіі Еўрапейскіх супольніцтваў павінна мець на мэце ўмацаванне і развіццё дружалюбных адносінаў і супрацоўніцтва паміж Беларуссю і ЕС.

Парафіраваны па выніках перагавораў праект пагаднення будзе накіраваны ў вышэйстаячыя інстанцыі Беларусі і Еўрапейскага саюза.

ДЗІЦЯЧЫЯ ІНФЕКЦЫІ: ЗНАЙСЦІ І АБЯСШКОДЗІЦЬ

Прамая лінія

Эпідэміялагічная сітуацыя цяперашняга сезона ў рэспубліцы характарызуецца перш за ўсё ўздымам колькасці выпадкаў рэспіраторных інфекцый, якія выклікаюцца так званымі простымі не грыпознымі вірусамі. Чханне, насмарк, кашаль — звычайныя спадарожнікі такіх захворванняў. Аднак на іх фоне людзі часта і не падазраюць, што шэраг небяспечных інфекцый маюць падобныя сімптомы. Напрыклад, менінгакокавая лакалізаваная інфекцыя нярэдка мае такія клінічныя праявы, як назафарынгіт, пры якім пашкоджваецца слізістая носа і горла. Асабліва небяспечна гэта для дзяцей. У такіх выпадках калі своечасова не звярнуцца да ўрача, узбуджальнік трапіць у кроў хворага, што можа прывесці да развіцця менінгакокцэліту — цяжкай інфекцыі, пры якой магчымы лятальны зыход.

Якія небяспечныя сімптомы павінны ўстрывожыць бацькоў, каб хутчэй звярнуцца па дапамогу да спецыялістаў? З гэтага пытання пачалася наша «прамая лінія», у якой узяла ўдзел загадчык кафедры дзіцячых інфекцыйных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, дацэнт, галоўны пазаштатны дзіцячы інфекцыяніст Міністэрства аховы здароўя Іна ГЕРМАНЕНКА.

Паводле яе слоў, абавязкова павінна насцярожыць высокая тэмпература ў дзіцяці, якая не рэагуе на прыём гарачкапаніжальных сродкаў і асабліва, калі пры гэтым з'яўляюцца мышачныя сутаргі. Таксама трэба тэрмінова звяртацца па медыцынскую дапамогу, калі на фоне інфекцыі развіваецца цяжкасць дыхання пры ўдыху, з'яўляецца грубы, гаўклівы кашаль. Устрывожыць павінен галаўны боль, які нярэдка суправаджаецца рвотай, не звязанай з прыёмам ежы. Гэта можа быць першай прыкметай нейратаксікозу ці менінгіту. Сур'ёзны сімптом — з'яўленне любой высыпкі. Асабліва, калі ў дзіцяці высокая тэмпература, што можа сігналізаваць аб такім цяжкім захворванні, як менінгакокцэлія.

Нярэдка бацькоў турбуе высокая тэмпература, а вось на нізкую яны звяртаюць менш увагі. І дарэмна. Калі слупок тэрмометра апускаецца ніжэй за 35,5 градуса, то гэта можа быць прыкметай як гіпатэрміі, так і сасудзістай недастатковасці, пашкоджанняў сэрца, надныракавых. Выклікаць трывогу павінна і такая з'ява: дзіця перанесла прастуду і, быццам бы, папраўляецца. Але раптам у яго з'яўляецца санлівасць, цяжкасці пры засыпанні. Такі сімптом можа ўказваць на пашкоджанні мозга, яго ацёк, развіццё энцэфаліту.

Застаецца падкрэсліць: ні ў якім разе нельга займацца самалячэннем. Толькі спецыяліст можа паставіць правільны дыягназ і прызначыць патрэбнае лячэнне.

☎ — Дзмітрый з Мінска турбуе. Мяне цікавіць, наколькі апраўданыя строгія меры ў такой, напрыклад, сітуацыі: у аднакласніка маіх дзяцей была дыярэя. І вось з-за аднаго чалавека ўсяму класу забаранілі ўдзельнічаць у агульнашкольных мерапрыемствах, была праведзена старанная санітарная апрацоўка класа, пасля якой у памяшканні стаяў вельмі непрыемны пах.

— У такім выпадку, безумоўна, неабходна было праводзіць супрацьэпідэміялагічныя мерапрыемствы, уключаючы санітарную апрацоўку класа. Гэта дазваляе пазбегнуць распаўсюджання кішэчнай інфекцыі, якая перадаецца як фекальна-аральным шляхам (напрыклад, праз брудныя рукі), так і паветрана-кропельным (асабліва вірусныя інфекцыі). А тое, што сродкі дэзінфекцыі часам маюць спецыфічны пах, цалкам зразумела: ён дапамагае змагацца і адпужваць небяспечныя мікробы і вірусы.

☎ — Сяргей Пятровіч. Званю з Мінска. Наша сям'я жыве недалёка ад лесу. Дзеці часта гуляюць на ўзлессі. Сёлета яны пацярпелі ад пакусаў кляшчоў. Скажыце, якія меры прафілактыкі можна прыняць, каб абараніць дзяцей ад гэтых насякомых. Ці існуюць супраць пакусаў нейкія прышчэпкі, лекавыя прэпараты?

— Прышчэпак супраць захворванняў, якія перадаюцца кляшчамі, фактычна не існуе, за выключэннем клешчавага энцэфаліту, які ў нас сустракаецца рэдка. Таму абарона дзяцей ад гэтых насякомых павінна ажыццяўляцца ў выглядзе звычайных мерапрыемстваў: апранаць адзенне, якое шчыльна прылягае, на галаве — абавязкова шапачка, перад наведваннем лесу апрацаваць адкрытыя ўчасткі цела рэпелентамі, а пасля прагулкі абавязкова правесці знешні агляд дзіцяці. Лекавых прэпаратаў для прафілактыкі ад пакусаў кляшчоў таксама няма.

Калі ж быў факт укусу, неабходна як мага раней кляшча зняць і даставіць у санэпідслужбу для даследавання. Калі гэта немагчыма, то трэба звярнуцца да доктара, які прызначыць курс антыбактэрыяльнай тэрапіі, каб папярэдзіць развіццё захворванняў, што перадаюцца кляшчамі.

☎ — Мяне завуць Зоя, тэлефаную з Мінска. Маёй дачцэ 8 гадоў. Працяглы час у яе трымалася высокая тэмпература. Пасля даследавання ў 3-й бальніцы ў дзяўчынкі знайшлі хламідыі ў крыві. Пасля лячэння тэмпература прайшла, але потым вярнулася, правялі паўторны аналіз, які паказаў, што хламідыі ўсё роўна захоўваюцца ў крыві, хоць у больш спакойным стане. Ці можна гэта вылечыць? І чым увогуле пагражае гэта сітуацыя?

— У гэтым выпадку важна ўстанавіць прычыну павышэння тэмпературы — ці інфекцыйнага яна паходжання. Для гэтага праводзіцца парацэтамолавы тэст. Для ўдакладнення ролі хламідый у дадзеным захворванні неабходна ўстанавіць ступень актыўнасці інфекцыі, для чаго выкарыстоўваюцца спецыяльныя тэсты і вылучэнне самога ўзбуджальніка. А выяўленая ў дзіцяці наяўнасць антыцелаў да дадзеных мікробаў сведчыць усяго толькі аб тым, што ўзбуджальнік пабываў у арганізме.

☎ — З Навагрудка турбуе Янына Віктараўна. У 19 гадоў мой сын страціў зрок на адным воку. Пасля даследавання ў яго знайшлі таксаплазмоз. Ці вылечваецца гэта хвароба і як сябе пры ёй паводзіць?

— Таксаплазмоз — гэта сістэмнае захворванне. У вашага сына таксаплазмы пашкодзілі вока. Аднак цысты (таксаплазмы) могуць пашкоджваць практычна ўсе органы і захоўвацца ў арганізме пажыццёва. Калі ў чалавека нармальная імунная сістэма, рэдка хварэе, то цысты могуць жыць у арганізме і не нагадваць аб сабе. Аднак, калі чалавек захварэе на цяжкую хваробу, пры якой пашкоджваецца імунная сістэма, напрыклад, на ВІЧ-інфекцыю, то цысты будуць пераходзіць з неактыўнага стану ў актыўны, разносіцца па органах і сістэмах і пашкоджваць іх.

Займаюцца лячэннем гэтай хваробы інфекцыяністы. Таму, калі ў вас ёсць пытанні, трэба звярнуцца да такога спецыяліста, каб ён пракантраляваў аналізы і вырашыў, актыўная гэта інфекцыя ці не, ці варта лячыцца на дадзеным этапе. Але, як правіла, для мужчын гэта не небяспечна. Больш церпяць ад такой паталогіі жанчыны, асабліва маладыя. А перадаюцца таксаплазмы ад жывёлін, як правіла, катоў ці ад прадуктаў, якія інфіцыраваны катамі.

☎ — Званю з Воранаўскага раёна. Завуць Юрый Юр'евіч. У мяне захварэла 6-месячнае дзіця. Звярнуліся да прыватнага ўрача ў горадзе Ліда. Па выніках аналізаў нам сказалі, што трэба класціся ў бальніцу. Да нашай райбальніцы — 70 кіламетраў, таму мы паехалі туды, дзе бліжэй: за 25 кіламетраў у Ліду. Аднак у Лідзе нам адмовілі ў шпіталізацыі і загадалі ехаць у свой раён. І толькі потым, калі мы звярнуліся да намесніка галоўнага ўрача, пасля яго ўмяшання нас паклалі ў бальніцу. Пытанне такое: ці мелі права адмовіць у шпіталізацыі і аглядзе майго дзіцяці?

— У нашай краіне дзеці абслугоўваюцца тэрытарыяльна. Аднак пры звароце з хворым дзіцем нават па месцы часовага пражывання яму заўсёды аказваецца медыцынская дапамога. Калі ж шпіталізацыя планавая, улічваецца тэрытарыяльная прыналежнасць. Варта мець на ўвазе, што на кожнага жыхара па месцы жыхарства плануюцца расходы на аказанне медыцынскай дапамогі. З гэтым і звязана рэкамендацыя медыкаў горада Ліды наконт лячэння вашага дзіцяці па тэрытарыяльнай прыналежнасці.

☎ — Валерыя, званю з Мінска раёна. Дзіцяці 8 гадоў. Хварэе не часта. Летась прышчэпку ад грыпу не рабілі. Абышліся анаферонам і народнымі сродкамі засцярогі. Да гэтага два гады прышчапляліся вакцынай інфмавак. На грып не хварэлі. Сёлета хацела б прышчапіць сына інтраназальнай вакцынай. Але ёсць некаторыя праблемы з носам: адэноіды і часам ацякае слізістая носа. Ці не проціпаказана прышчэпка такой «жывой» вакцынай майму дзіцяці і ці можна разлічваць на тое, што гэта прышчэпка не справакуе захворванне адразу пасля вакцынацыі?

— Гаворка ідзе пра «жывую» вакцыну, і трэба быць гатовым да таго, што арганізм можа па-рознаму адрэагаваць на вірус, які ўтрымліваецца ў вакцыне. Можа праявіцца лёгкае грыпападобнае захворванне. Але ў выніку вакцынацыі гэтым прэпаратам фарміруецца добры трывалы імунітэт. І для гэтай вакцыны практычна няма проціпаказанняў. У вашым выпадку, калі ёсць праблемы з носам, усё ж лепей выкарыстоўваць вакцыны тыпу грыпол, ваксігрып, інфлювак.

☎ — На провадзе Алена з Мінска. Майму дзіцяці 3 гады і 2 месяцы. У жніўні яно пайшло ў садок. А ў сярэдзіне кастрычніка захварэла на рынафарынгіт і ВРЗ. Вострыя сімптомы былі знятыя, але запаленчыя працэсы ў горле доўжацца дагэтуль. Урач выпісаў толькі прэпараты. Але прэпарат не дапамагае. Павялічаны мандаліны, лімфавузлы, па задняй сценцы горла пастаянна сцякае слізь. Як нам лячыцца? І ці можна наведваць дзіцячы садок?

— Не бачачы ваша дзіця, я не магу дакладна штосьці рэкамендаваць. Аднак выкарыстанне толькі пратарголу недастаткова. Магчыма, трэба наведаць лор-урача, каб вам прызначылі мясцовую санацыю. На сёння ёсць мясцовыя антыбактэрыяльныя прэпараты, якія па паказаннях можна прымаць. Што датычыцца дзіцячага садка. Існуе перыяд адаптацыі да яго. На працягу першага года наведвання садка, калі дзеці сустракаюцца з новымі вірусамі і мікробамі, малыя могуць хварэць да 8 разоў за год, пакуль не выпрацуецца імунітэт. Сад наведваць можна, але нос прасаніраваць трэба. Я параіла б наступнае. Па-першае, вы павінны навучыць дзіця дыхаць носам і не хутаць яго вельмі моцна. Па-другое, бацькі не павінны курыць, памяшканні кватэры трэба часцей праветрываць. Патрэцяе, можна выкарыстоўваць для прамывання насавых хадоў фізіялагічныя растворы натрыю хларыду, саліну, гумеру або прыгатаваць 1-працэнтны раствор соды і солі.

Перад тым як весці дзіця ў садок, трэба прачысціць носік, прамыць падсоленым растворам — па 3—5 кропель у насовыя хады, закапаць таксама лейкацытарны інтэрферон. За некалькі хвілін перад выхадам з дому можаце, калі дзіця не алергік, змазаць насавыя хады масляным растворам ці маззю, напрыклад, бараментолам, эваментолам, пінасолам або проста вазелінавым маслам. З народных сродкаў можна парэкамендаваць закапваць нос сокам каланхоэ ці алоэ.

— Нам педыятр параіў зараз паехаць адпачыць у Крым. Гэта не шкодна?

— У прынцыпе гэта вам не проціпаказана. Але ўявіце, як вы перанесяце доўгі пераезд з такім малым дзіцем. Я раіла б ехаць у такі час года, калі дзіцяці будзе 5 гадоў. А лепш за ўсё, калі ёсць магчымасць, аздараўляцца ў Беларусі. Акрамя таго, загартоўвайце дзіця, гуляйце ў парках, дыхайце свежым паветрам. Гэта будзе больш карысна і больш танна.

— Турбуе Барысаў. Наталля Іванаўна. Падкажыце, якую першую дапамогу могуць аказаць бацькі, каб збіць у дзіцяці высокую тэмпературу?

— Маючы малое дзіця ў сям'і, неабходна дома трымаць аптэчку. У гэтай аптэчцы абавязкова павінен быць парацэтамол — сродак нумар адзін, які рэкамендуецца Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя для зніжэння тэмпературы. Калі вы ведаеце, што высокая тэмпература ў дзіцяці слаба рэагуе на парацэтамол, то наступны прэпарат, які павінен быць у аптэчцы — ібупрафен (ёсць спецыяльныя дзіцячыя формы). Як сродак экстранай дапамогі можна выкарыстоўваць фізічныя метады ахаладжэння, але не захапляцца. Высокая тэмпература небяспечная, перш за ўсё, для галаўнога мозга. Таму холад трэба прыкладаць да галавы.

Калі тэмпература не рэагуе на прыём гарачкапаніжальных сродкаў, трэба выклікаць доктара ці «хуткую дапамогу». Бо калі ў наяўнасці мікробная бактэрыяльная інфекцыя, то пакуль не прызначаць адэкватны антыбіётык, тэмпература будзе высокай.

Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.
(Працяг будзе.)

АДШУКВАЕЦЦА ПЯЦІКЛАСНІК

Супрацоўнікі Пухавіцкага РАУС адшукваюць 10-гадовага хлопчыка, які пасля заняткаў у школе не вярнуўся дадому.

Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, Андрэй Жаўноў, які вучыцца ў пятым класе, каля трох гадзін дня ў аўторак выйшаў са школы № 4 у Мар'інай Горцы і дагэтуль яго месцазнаходжанне невядома. Асаблівая прымета хлопчыка — шрам на шыі злева ад укусу сабакі ў выглядзе невялікіх плямаў. Таксама падлетак меў пры сабе школьны рукзак яркаблакітнага колеру.

Ігар ГРЫШЫН.

А Ў ВОЛЬНЫ ЧАС АХОЎВАЮЦЬ НАС

Каманда «Мінск» Дэпартамента аховы МУС сёлета ўпершыню ўзяла ўдзел у чэмпіянаце свету па футболе ў зале сярод прадстаўнікоў праваахоўных структур. XIII чэмпіянат свету праходзіў у бельгійскім горадзе Ломелі і сабраў 48 камандаў з 25 краін свету.

Беларуская каманда пачала сваё выступленне з разгромных перамог — 2:0 над камандай Мальты, 5:0 над камандай Галандыі, 3:0 над камандай Італіі, 4:1 над камандай Бельгіі, 5:1 над камандай Турцыі, 8:0 над камандай ЗША, 6:2 над камандай Ірландыі, 4:1 над камандай Румыніі. Саступіўшы камандзе «Тэхкрымпаліцыя» з Санкт-Пецярбурга, беларусы выбылі з барацьбы, заняўшы 5-е месца сусветнага першынства.

Як адзначыў начальнік Дэпартамента аховы МУС, кіраўнік беларускай дэлегацыі на чэмпіянаце свету, палкоўнік міліцыі Сяргей Буйноўскі, перамога над усімі камандамі ў нашай падгрупе, якая прадстаўлена краінамі з высокім узроўнем футбола, сведчыць аб добрай падрыхтоўцы беларусаў. «Прыемна, што наша каманда прымусіла лічыцца з сабой такіх моцных сапернікаў. Трэба ўлічваць, што прафесіяналаў у нашай камандзе няма, у паўсядзённым жыцці ўсе ігракі — афіцэры, якія нясуць службу. Праўда, некаторыя з іх у мінулым былі прафесійнымі спартсменамі, магчыма, гэта і дапамагло», — расказаў Сяргей Буйноўскі.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Спорт-тайм

Федэрацыя футбола вызначыла лепшых

Сяргей Верамко, Арцём Радзькоў, Ігар Стасевіч і Раман Васілюк — лепшыя футбалісты 17-га чэмпіянату Беларусі па футболе. Спіс лепшых быў зацверджаны на пасяджэнні выканкама асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола». Лепшы футбаліст чэмпіянату — Раман Васілюк (ФК «Гомель»), лепшы варатар — Сяргей Верамко («Нёман», Гродна), лепшы абаронца — Арцём Радзькоў (БАТЭ, Барысаў), лепшы паўабаронца — Ігар Стасевіч (БАТЭ Барысаў), лепшы нападаючы — Раман Васілюк (ФК «Гомель»).

Гандбалісткі чакаюць жараб'ёўкі

Беларускія гандбалісткі занялі трэцяе месца ў сваёй адборачнай групе да Еўра-2008 і выйшлі ў стадыю плей-оф. Каманда Канстанціна Шараварава перамагла зборныя Ізраіля (40:12), Босніі і Герцагавіны (35:29) і Грэцыі (39:23), згуляла ўнічыю з літоўкамі (27:27) і прайграла ў заключным матчы ісландкам (29:30). У наступны раўнд таксама прабіліся спартсменкі Літвы, Ісландыі, Славакіі, Партугаліі, Чарнагорыі, Чэхіі, Турцыі, Італіі. Нацыянальныя дружыны Аўстрыі, Харватыі, Польшчы, Іспаніі, Румыніі, Славеніі, Сербіі, Галандыі, Украіны, Даніі і Швецыі былі вызваленыя ад кваліфікацыі. Жараб'ёўка адбудзецца ў студзені, фінальны этап ЧЕ — у снежні наступнага года ў Македоніі. Яго ўдзельніцамі стануць пераможцы дзесяці паядынкаў матчаў плей-оф. Таксама за ўзнагароды будуць змагацца гаспадыні турніру і лепшыя па выніках Еўра-2006 (нарвежкі, расіянкі, немкі, французжанкі, венгеркі).

Трэнер французаў абвінаваціў УЕФА

У футбольным свеце распальваецца скандал. Галоўны трэнер футбольнай зборнай Францыі Раймон Даменек заступіўся незадаволены сістэмай жараб'ёўкі групавога турніру Еўра-2008 і назваў яе «вар'яцкай». У прыватнасці, настаўнік не разумее, чаму чэмпіёны свету не трапілі ў першы кошык посеву, дзе аказаліся гаспадары турніру, дзеючы чэмпіён кантынента і Галандыя, якая набрала больш за ўсіх ачкоў у двух адборачных турнірах.

Нагадаем, што Францыя трапіла ў «групу смерці» з галандцамі, італьянцамі і румынамі, таму кагосьці з фаварытаў балельшчыкі страцяць яшчэ на гэтай стадыі спаборніцтваў.

Чэмпіён Беларусі — 138-ы ў Свеце

Міжнародная федэрацыя футбольнай гісторыі і статыстыкі абнародавала новы рэйтынг клубных камандаў свету. Усяго ў рэйтынгу Міжнароднай федэрацыі футбольнай гісторыі і статыстыкі 350 клубаў. Сярод іх адзін беларускі клуб — барысаўскі БАТЭ. Наша каманда размясцілася на 138-м месцы з 98,5 баламі. Адзначым, што ў папярэднім рэйтынгу (ад 1 лістапада) барысаўчане былі на тым жа месцы і з той жа сумай балаў.

Першае месца ў спісе займае іспанская «Севілья». На другім і трэцім месцах «Манчэстар Юнайтэд» і «Чэлсі».

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

«ГАЗПРАМ» УЗНЯЎ ЦАНУ НА ГАЗ ДЛЯ УКРАІНЫ. КАЗАХСТАН НЕ ХОЧА АДСТАВАЦЬ

У 2008 годзе Украіна будзе атрымліваць імпартны газ з Расіі па цане 179,5 долараў за тысячу кубаметраў.

Адпаведнае пагадненне было дасягнута ў ходзе перамоў кіраўніка расійскага газавага канцэрна Аляксея Мілера з міністрам паліва і энергетыкі Украіны Юрыем Бойкам. У 2007 годзе Украіна атрымлівала газ па 130 долараў за тысячу кубаметраў. Кіеў можа часткова кампенсаваць свае затраты, павялічыўшы тарыфы на транспарціроўку расійскага газу ў Заходнюю Еўропу.

Тым часам пра намер узняць цану на экспартуемы ў Расію газ можа заявіць Казахстан. У 2006 годзе прэзідэнты гэтых дзяржаў дамовіліся, што «Газпрам» будзе атрымліваць газ па 138—140 долараў за тысячу кубаметраў. Годам раней цэны складалі ўсяго 47—50 долараў за той жа аб'ём.

У ГЕРМАНІІ 64-ГАДОВАЯ ЖАНЧЫНА НАРАДЗІЛА ДЗЯЎЧЫНКУ

64-гадовая жанчына стала самай пажылой маці ў Германіі: некалькі дзён таму яна нарадзіла дзяўчынку ў клініцы горада Ашафенбурга на поўдні Баварыі. Каб зачаць дзіця, спатрэбілася донарская яйцаклетка, якая была аплоднена спермай мужа пацыенткі. Паколькі донарства яйцаклетак у Германіі забаронена, аперацыя была праведзена за межамі краіны.

Паводле слоў прадстаўніка клінікі, дзіця, якое важыла пры нараджэнні каля двух кілаграмаў, з'явілася на свет у выніку кесарава сячэння. Зараз стан здароўя маці і дзіця не выклікаюць апасенняў. Нягледзячы на свой паважаны ўзрост, жыхарка Германіі не з'яўляецца самай узроставай маці на планеце. Нагадаем, што напрыканцы мінулага года 66-гадовая іспанка нарадзіла здаровых блізнят у амерыканскай клініцы.

НА АРБІЦЕ СЭКСУ НЯМА?

Расійскія вучоныя абвяргаюць інфармацыю некаторых замежных СМІ пра тое, што расійскія касманаўты і амерыканскія астранаўты займаліся сэксам на арбіце, паведамляе interfax.by.

«Ні пра які сэкс на арбіце я не чуў. У нас у краіне не было падобных эксперыментаў і не было эпізодаў, якія б сведчылі пра тое, што падчас нейкіх экспедыцый касманаўты займаліся сэксам», — адзначыў намеснік кіраўніка інстытута медыка-біялагічных праблем Валерый Багамолаў, каментуючы публікацыю ў брытанскай «The Guardian». Згодна з інфармацыяй газеты, ў 1996 годзе НАСА правяло даследаванне па пытанні: «у якіх позах можна займацца сэксам ва ўмовах бязважкасці» . Пасля праверкі з дапамогай камп'ютарнай сімуляцыі з 20 сэксуальных поз пакінулі 10. Пасля гэтага быццам бы двое паддоследных паспрабавалі ажыццявіць прапанаванае камп'ютарам ва ўмовах бязважкасці. Толькі чатыры пазіцыі былі прызнаныя прыдатнымі для сэксу на арбіце, паведаміла «The Guardian». У сваю чаргу Багамолаў паведаміў, што не мае інфармацыі пра такія эксперыменты амерыканцаў.

ФІЗІЧНА АКТЫЎНЫЯ ТАЎСТУНЫ ЖЫВУЦЬ ДАЎЖЭЙ ЗА ХУДЫХ ЛЯНІЎЦАЎ

Узровень фізічнай актыўнасці ўплывае на працягласць жыцця больш, чым маса цела, паведаміў Journal of the American Medical Association.

Спецыялісты з Універсітэта Паўднёвай Караліны правялі даследаванне з удзелам 2603 пажылых людзей ва ўзросце 60 гадоў і старэй. Назіранне вялося на працягу 12 гадоў. За гэты перыяд 450 чалавек памерлі. Прааналізаваўшы атрыманую інфармацыю, вучоныя высветлілі, што ступень фізічнай актыўнасці аказвала заўважны ўплыў на працягласць жыцця. Паказчыкі смяротнасці ў самай маларухомай групе былі ў чатыры разы вышэй, чым у групе найбольш фізічна актыўных людзей. «Мы выявілі, што фізічна актыўныя людзі, якія пакутавалі ад атлусцення, мелі больш нізкі ўзровень смяротнасці, чым не спартыўныя людзі з нармальнай вагой ці худыя», — паведаміў кіраўнік праекта. Вучоныя таксама адзначылі, што нават невялікія намаганні па павелічэнні фізічнай актыўнасці станоўча адбіваюцца на стане здароўя.

Пешаход пад коламі аўтамабіля

22-гадовы гамяльчанін аднекуль вяртаўся дадому ў тры гадзіны сорак хвілін. Спяшаўся вельмі хлопец, мяркуючы па ўсім, і таму, нядоўга думаючы, у цёмным месцы па вуліцы Рэчыцкая шаша пералез агароджу і подбегам накіраваўся да процілеглай. А тут, як на тое ліха, легкавушка... Смерць на месцы. У загінулага не было на адзенні ці якіх-небудзь рэчах святлоадбівальных элементаў, што магло б прадухіліць непапраўнае.

А ўсяго за 10 месяцаў, як паведамілі на прэс-канферэнцыі намеснік начальніка УУС Гомельскага аблвыканкама, начальнік міліцыі грамадскай бяспекі Аляксандр Дзяркач і начальнік Дзяржаўтаінспекцыі вобласці Валерый Крупскі, адбылося 254 наезды транспарту на пешаходаў на дарогах і аўтамагістралях. Пры гэтым 49 чалавек развіталіся з жыццём і 221 атрымалі раненні і траўмы рознай ступені цяжкасці. Характэрна, што 127 дарожна-транспартных здарэнняў адбылося па віне саміх пешаходаў, 27 з якіх напаткала смерць, а 103 апынуліся на бальнічных ложках.

Як устаноўлена, абсалютная большасць гэтых выпадкаў (87 працэнтаў) адносіцца да вячэрняга ці начнога часу, калі цёмна, і пешаходы не абазначаюць сябе флікерамі, наклейкамі, павязкамі. Асобныя з іх знаходзіліся нападпітку, пераходзілі ці перабягалі дарогу дзе ім уздумаецца. На прэс-канферэнцыі прагучала думка аб тым, што адначасова з больш актыўнай прапагандай сярод насельніцтва выкарыстання святлоадбівальных элементаў да парушальнікаў руху трэба прымяняць больш рашучыя меры ўздзеяння.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

На хвалі 101.7 FM

МУЖЧЫНСКАЯ ЛОГІКА... І ЎСЁ ІНШЫЯ ПАЧУЦЦІ

У Сусветны дзень інфармацыі тэлеканал АНТ адкрыў новую FM-радыёстанцыю — «Радыё АНТ». Даверылі яму эфірную частату 101,7 fm. А дату «нараджэння» выбралі, зразумела, невыпадкова. Справа ў тым, што тып новай станцыі — інфармацыйна-музычны, але з пераважным ухілам у інфармацыйнасць і пазнавальнасць.

Усё новае ў нас чамусьці падкрэслена любяць называць «першым». Скажам, у навагоднія святы пачне вяшчанне «NETradio», якое стваральнікі прадставілі як «першае прафесійнае інтэрнэт-радыё». Сёння стартуе радыё партала Tut.by — можна не сумнявацца, што і яно стане ў сваім родзе першым. Радыё АНТ, паводле ідэі стваральнікаў і згодна з праведзенымі маркетынгавымі даследаваннямі, павінна стаць сярод 15-ці ужо існуючых станцый першым мужчынскім радыё.

Што значыць — мужчынскае радыё? Значыць, праграмы распрацоўваюцца з улікам інтарэсаў і спецыфікі менавіта гэтай аўдыторыі. У навінах першасныя факты (высновы мужчыны зробяць самі), у перадачах — дынаміка. З сямі раніцы да шасці вечара ў эфіры новага радыё гучаць толькі навіны і «чыстая» музыка без каментарыяў вядучага, а таксама карысна-пазнавальныя праграмы — прысвечаныя аўтамабілям, высокім тэхналогіям, бізнэсу і г.д. Дыджэі пачынаюць актыўна працаваць увечары. Пры тым у музычным сэнсе фармат радыё АНТ — фонавы, «мяккі», складзены з ненавязлівых лірычных кампазіцый і правераных часам хітоў.

Сярод вядучых радыё АНТ хапае вядомых імёнаў — напрыклад, Таццяна Сулімава, Валянцін Серада, Іван Падрэз (экс-«Радыё Рокс»), Руслан Ешчанка і Дзяніс Вавілаў (экс-«Мір»), дый дырэктар новай станцыі Святлана Уладзімірава, вядомая слухачам па рабоце на «Альфа Радыё». Але асноўная стаўка, як расказалі нам у прэс-службе АНТ, робіцца ўсё ж на новыя імёны і галасы: з тых кандыдатаў, хто прайшоў даволі жорсткі кастынг, падабралася таленавітая і цікавая каманда.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

З першым юбілеем шчыра віншуем начальніка Бярозаўскага раённага вузла паштовай сувязі ***М.М. ХЛЯБЕЦ****. Здароўя вам, шаноўная Марыя Мікалаеўна, спору ды ладу ў працы, шчасця ў асабістым жыцці!*

Звяздоўцы.

Оперупаўнаважаны «пярэварацень»

Супрацоўнік Полацкага аддзела ўнутраных спраў на транспарце паспрабаваў пераўтварыць барацьбу з эканамічнымі злачынствамі ў прыватны карупцыйны бізнэс.

Паводле звестак Генеральнай пракуратуры, оперупаўнаважаны службы БЭЗ выявіў грамадзянку, якая незаконна гандлявала каштоўнымі металамі. За падобнае парушэнне прадугледжана крымінальная адказнасць. Аднак міліцыянер прапанаваў гандлярцы адкупіцца. Плата за адмову ад крымінальнага пераследу павінна была скласці 12 тысяч долараў. Жанчына вымушана была пагадзіцца на такія ўмовы, бо свабода даражэй, і перадала вымагальніку першы «транш» хабару ў памеры 6 тысяч долараў. Нядобрасумленнага міліцыянера злавілі за руку адразу ж пасля таго, як ён атрымаў «карупцыйны ганарар».

Дарэчы, гэта была не першая спроба оперупаўнаважанага «пярэваратня» разбагацець на ніве барацьбы з эканамічнымі злачынствамі. Як высветліла Беларуская транспартная пракуратура, міліцыянер некалькі месяцаў быў на ўтрыманні ў электрамеханіка Віцебскага пасажырскага ўчастка аддзялення Беларускай чыгункі. Справа ў тым, што чыгуначнік таксама быў не без грахоў: сістэматычна ўвозіў у нашу краіну расійскія цыгарэты без акцызных марак. Даведаўшыся пра гэта, оперупаўнаважаны вылучыў «цыгарэтнаму кантрабандысту» ўльтыматум: плаці штомесяц па 100 долараў, інакш вылеціш з работы. Электрамеханік пагадзіўся плаціць. І невядома колькі часу «даіў» бы яго прадпрымальны оперупаўнаважаны, калі б «пярэваратня» не затрымалі. Неўзабаве вымагальнік у пагонах апынецца на лаве падсудных.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Краты для былога дырэктара

Восем гадоў Светлагорскі завод жалезабетонных вырабаў і канструкцый узначальваў Аляксандр Субоцін, які лічыўся ў горадзе нядрэнным дырэктарам. Да таго часу, пакуль яго асоба не трапіла ў поле зроку Упраўлення КДБ Беларусі па Гомельскай вобласці. А фінал такі: пяць гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму і забарона на такі ж тэрмін пасля выхаду з турмы займаць пасады, звязаныя з выкананнем арганізацыйна-распарадчых функцый.

Дырэктар іншым разам дзейнічаў у інтарэсах расійскіх фірмаў, свайго кашалька і ва ўрон роднаму прадпрыемству. Так, яшчэ ў 2000 годзе ён заключыў з адной маскоўскай фірмай-пасрэднікам тавараабменны дагавор, які, на першы погляд, быў узаемавыгадным. На справе ж аказалася іншае. Калі фірма атрымала на 3,8 мільёна расійскіх рублёў дэфіцытных жалезабетонных апор, якія былі запатрабаваны і на айчынным рынку, дык завод — устарэлае абсталяванне па завышанай цане. Так, разукамплектаваная зварачная машына была на 40 працэнтаў даражэй за аналагічную новую. Субоцін разам з жонкай з 2001 па 2003 гады рэгулярна аздараўляўся ў адным з санаторыяў Кіславодска за кошт сваіх расійскіх партнёраў выключна ў сувязі з займаемай пасадай, за спрыяльнае вырашэнне пытанняў, якія ўваходзілі ў яго кампетэнцыю.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Стыхія

У КЛІМАТЫЧНЫХ АНАМАЛІЯХ НЕ ЎСЁ ТАК АДНАЗНАЧНА

Сёлета сусветная ўзроўні тэмпературы паверхні Зямлі былі самымі высокімі за ўсю гісторыю метэаназіранняў, якія вядуцца з 1880 года, заявіў на сустрэчы з беларускімі журналістамі ў Маскве прэзідэнт Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі, кіраўнік Федэральнай службы па гідраметэаралогіі і маніторынгу навакольнага асяроддзя (Расгідрамет) Аляксандр Бядрыцкі.

У 2007 годзе надвор'е ў многіх рэгіёнах Зямлі вызначалася рэкордными па сваіх характарыстыках экстрэмальнымі прыроднымі з'явамі. Сярэдняя тэмпература на планеце ўзрасла больш чым на паўтара градуса па Цэльсію.

Усе гэтыя вялікія непрыемнасці — толькі «кветачкі». Згодна з асобнымі даўгатэрміновымі прагнозамі, няўхільнае пацяпленне можа паскорыць раставанне леднікоў і тым самым выклікаць павышэнне ўзроўню мора. Дастаткова яму ўзняцца на 60 сантыметраў — і сотні м

«ІЛЬГОТНАЯ РАСКЛАДКА»: КАМУ І ШТО ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 5 снежня.)

Усё залежыць ад наступстваў

Звольненыя ў запас асобы, што былі накіраваны для ўдзелу ў баявых дзеяннях у Афганістан ці іншыя краіны, будуць карыстацца льготамі толькі ў выпадку атрымання падчас ваенных дзеянняў ранення, кантузіі ці знявечання. І да таго ж тут прадугледжваецца яшчэ адна ўмова — такія асобы не павінны працаваць зараз.

Што ж да саміх ільгот гэтай катэгорыі грамадзян, то яны наступныя: бясплатнае забеспячэнне лекамі па рэцэптах урачоў, бясплатны выраб і рамонт зубных пратэзаў (за выключэннем пратэзаў з каштоўных металаў), бясплатнае забеспячэнне іншымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі, першачарговае бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне ці аздараўленне не больш чым адзін раз у два гады, бясплатны праезд на ўсіх відах (апроч таксі) гарадскога і прыгараднага пасажырскага транспарту, а таксама на міжгародніх аўтобусах у межах свайго раёна, бясплатны праезд па спецыяльных талонах на ўнутраных лініях воднага, паветранага ці аўтамабільнага транспарту і ў беларускіх чыгуначных вагонах туды і назад адзін раз у два гады або 50-працэнтная скідка з кошту такога праезду туды і назад адзін раз у год.

Тэхсродкі плюс пуцёўкі

У ці не самай шматколькаснай катэгорыі ветэранаў працы, захаваюцца ўсяго дзве льготы — права на забеспячэнне сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі і на забеспячэнне санаторна-курортнай пуцёўкай на ўмовах частковай аплаты ў залежнасці ад даходу.

Суправаджальнік не «знікае»

Як вядома, самастойна дабрацца да здраўніцы можа далёка не кожны атрымальнік пуцёўкі. Многім патрабуюцца суправаджальнікі, прычым апошніх таксама закрануць некаторыя змены.

Так, з 17 снежня асобы, якія суправаджаюць на лячэнне інваліда I групы, дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў ці інваліда I групы з дзяцінства ў выніку наступстваў Вялікай Айчыннай вайны могуць разлічваць на бясплатны праезд да здраўніцы на ўсіх, апроч таксі, відах гарадскога, прыгараднага транспарту, на міжгароднім аўтобусе ў межах свайго адміністрацыйнага раёна, а таксама на бясплатнае забеспячэнне санаторна-курортнай пуцёўкай без лячэння. А асобам, якія суправаджаюць інваліда вайны I групы, апроч таго даецца права на атрыманне адзін раз у год 50-працэнтнай скідкі з кошту праезду ў здраўніцу (туды і назад) на ўнутраных лініях воднага, паветранага, аўтамабільнага пасажырскага транспарту ці ў вагонах беларускага фарміравання пасажырскіх цягнікоў.

Парушыў — застаўся ні з чым

Ці не галоўная асаблівасць прадастаўлення льгот людзям з абмежаванымі магчымасцямі — прызнанне таго, што інваліднасць не наступіла ў сувязі з проціпраўнымі дзеяннямі, алкагольным, наркатычным ці таксічным ап'яненнем, а таксама ў сувязі з наўмысным пашкоджаннем уласнага здароўя.

Пры гэтых умовах сітуацыя выглядае так. Інваліды I і II груп будуць мець права на 90-працэнтную скідку з кошту лекаў ці неправязачных матэрыялаў (у выпадку наяўнасці адпаведных рэцэптаў і медыцынскіх заключэнняў), на бясплатны выраб і рамонт зубных пратэзаў (за выключэннем пратэзаў з каштоўных металаў), забеспячэнне іншымі тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі, першачарговае бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне не больш за адзін раз у два гады (для непрацуючых) ці забеспячэнне санаторна-курортным лячэннем на ўмовах частковай аплаты ў залежнасці ад даходу (для працуючых грамадзян гэтай катэгорыі), бясплатны праезд у гарадскім, прыгарадным пасажырскім транспарце (апроч таксі) і на міжгародніх аўтобусах у межах свайго раёна, нарэшце, на 50-працэнтную скідку з кошту тэхабслугоўвання і камунальных паслуг. Праўда, апошняя гарантыя датычыцца толькі інвалідаў I і II груп, якія не маюць працаздольных членаў сям'і, пражываюць адны, разам з інвалідамі гэтых жа груп ці непрацуючымі пенсіянерамі, што дасягнулі агульнага пенсійнага ўзросту.

Больш значныя змены чакаюць інвалідаў III групы. З 17 снежня ў іх застаецца толькі права на забеспячэнне санаторна-курортнымі пуцёўкамі на ўмовах частковай аплаты ў залежнасці ад даходу.

Адначасова дзеці-інваліды ва ўзросце да 18 гадоў будуць мець права на бясплатныя лекі па рэцэптах, бясплатны выраб і рамонт зубных пратэзаў (за выключэннем пратэзаў з каштоўных металаў), забеспячэнне сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі, першачарговае бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне, бясплатны праезд на ўсіх відах гарадскога, прыгараднага транспарту і на аўтобусах у межах адміністрацыйнага раёна па месцы жыхарства.

«Чарнобыльцы» — асобная гаворка

Напэўна, самыя сур'ёзныя змены датычацца «чарнобыльцаў». З 17 снежня да льготнікаў ужо не будуць адносіцца грамадзяне, якія бралі ўдзел у ліквідацыі катастрофы ў 1986—87 і 1988—89 гадах, грамадзяне, эвакуіраваныя ці перасяленыя з зоны адчужэння, першапачатковага і наступнага адсялення, а таксама грамадзяне, якія пасля аварыі пакінулі гэтыя зоны самастойна. І ў тым ліку — эвакуіраваныя ці перасяленыя з небяспечных раёнаў дзеці.

Разам з тым пэўныя гарантыі менавіта дзецям застаюцца. Так, непаўналетнія грамадзяне, якія пражываюць у зоне з перыядычным радыяцыйным кантролем, зоне першачарговага і наступнага адсялення, а таксама ў зоне з правам на адсяленне захаваюць права на бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне тэрмінам да аднаго месяца, права на бясплатны праезд у прыгарадным пасажырскім транспарце, а таксама на бясплатны праезд у пасажырскіх вагонах беларускага фарміравання ў межах Беларусі, на ўнутраных лініях воднага і міжгароднята аўтатранспарту ад месца жыхарства да месца санаторна-курортнага лячэння, дыспансэрнага, амбулаторнага ці клінічнага абследавання і назад.

Прадугледжваюцца пэўныя гарантыі і для грамадзян, якія пацярпелі ад ЧАЭС непасрэдна. Так, асобы, што перанеслі прамянёвую хваробу, інваліды I, II груп і дзеці-інваліды ў выніку катастрофы з 17 снежня будуць мець права на: 90-працэнтную скідку з кошту лекаў і неправязачных матэрыялаў паводле рэцэптаў ці адпаведных медыцынскіх заключэнняў (грамадзяне з прамянёвай хваробай і «чарнобыльскія» інваліды I і II груп); бясплатнае забеспячэнне лекамі (дзеці-інваліды з прычыны Чарнобыля); бясплатны выраб і рамонт зубных пратэзаў (за выключэннем пратэзаў з каштоўных металаў); забеспячэнне тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі; першачарговае бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне не больш за адзін раз у два гады (непрацуючыя інваліды-чарнобыльцы); забеспячэнне санаторна-курортным лячэннем і аздараўленнем на ўмовах частковай аплаты ў залежнасці ад даходу (працуючыя інваліды-чарнобыльцы); бясплатны праезд на ўсіх, апроч таксі, відах гарадскога і прыгараднага пасажырскага транспарту, а таксама на міжгароднім аўтатранспарце ў межах свайго раёна; на 50-працэнтную скідку па аплаце за тэхабслугоўванне і камунальныя паслугі — для асобаў, якія не маюць працаздольных членаў сям'і, пражываюць адны, разам з інвалідамі гэтых жа груп ці непрацуючымі пенсіянерамі, што дасягнулі агульнага пенсійнага ўзросту.

Нарэшце, «чарнобыльскія» інваліды III групы захаваюць ільготу па забеспячэнні пуцёўкамі з частковай аплатай у залежнасці ад даходу.

На дзяцей амаль без змяненняў

З 17 снежня павінна спыніцца практыка прадастаўлення бясплатных лекаў на дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў. У той жа час па сутнасці ўсе астатнія гарантыі самым маладым жыхарам застануцца. У прыватнасці, у дзяцей да 7 гадоў застанецца права бясплатнага праезду на гарадскім, прыгарадным транспарце, а таксама бясплатны праезд на міжгародніх аўтобусах у межах свайго раёна; у дзяцей да 5 гадоў — права на бясплатны праезд у цягніках ці вагонах беларускага фарміравання і бясплатны праезд на пасажырскім аўтатранспарце ўнутры краіны без магчымасці заняцця асобнага месца; для дзяцей ва ўзросце ад 5 да 10 гадоў на такі праезд працягнуць дзейнічаць скідкі, а дзеці з сельскай мясцовасці змогуць бясплатна ездзіць на навучанне ў беларускіх цягніках і на аўтамабільным пасажырскім транспарце ў перыяд з 1 верасня па 30 чэрвеня.

Далей. Да дасягнення 18-гадовага ўзросту па-ранейшаму бясплатна змогуць карыстацца гарадскім пасажырскім і прыгарадным транспартам дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без бацькоўскай апекі. Плюс да таго дзецям ва ўзросце да 18 гадоў паводле заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі будуць прадастаўляцца бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне. А ў выпадку неабходнасці накіравання ў здраўніцы тыпу «Маці і дзіця» адзін з бацькоў-суправаджальнікаў стане плаціць за пуцёўку 15 працэнтаў яе сабекошту.

Прывілеі дэпутатаў — у мінулым

І некалькі слоў аб іншых катэгорыях. З 17 снежня асобы, якія пражываюць у дамах-інтэрнатах, захаваюць толькі права на атрыманне бясплатных лекаў паводле рэцэптаў, донары — права на забеспячэнне санаторна-курортным лячэннем і аздараўленнем на ўмовах частковай аплаты ў залежнасці ад даходу, студэнты і навучэнцы — права на санаторна-курортнае лячэнне з аплатай пуцёўкі ў памеры 15 працэнтаў яе сабекошту і права на аздараўленне з частковай аплатай пуцёўкі ў залежнасці ад узроўню даходу.

Асобы радавога і кіруючага складу органаў унутраных спраў, фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях змогуць разлічваць на атрыманне дапамогі ў ваенна-медыцынскіх арганізацыях, у выпадку звальнення паводле захворвання ў сувязі з прызнаннем іх непрыдатнымі да вайсковай службы з выключэннем з воінскага ўліку — на першачарговае бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне не больш за адзін раз на працягу двух гадоў, а ў выпадку неабходнасці працягу шпітальнага лячэння — на бясплатнае наведванне санаторыя.

Пры гэтым існуе цэлы пералік катэгорый, ільготы і прывілеі для якіх знікнуць увогуле. У прыватнасці, гэта датычыцца пракурорскіх работнікаў, а таксама цяперашніх і былых дэпутатаў.

Сяргей ГРЫБ.

P.S. З 17 снежня разам з Законам «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях» у Беларусі пачне дзейнічаць Указ кіраўніка дзяржавы «Аб адраснай сацыяльнай падтрымцы насельніцтва». Тэкст апошняга дакумента дапрацоўваецца зараз і ў бліжэйшы час мяркуем паznаёміць з ім чытачоў «Звязды».

ПАЛАЦ ПАЦЁМКІНА — АДНОЎЛЕНЫ СІМВАЛ СТАРАЖЫТНАГА КРЫЧАВА

У знакамітым Пацёмкінскім палацы цяпер кіпіць праца. Няшмат часу засталося да здачы важнага і нават знакавага для Крычава аб'екта. Напрыканцы снежня спецыяльная камісія будзе прымаць адноўлены помнік архітэктуры. Рэстаўрацыя палаца цягнулася больш за 20 гадоў. Спачатку развалілася адна дзяржава, потым у маладой Беларусі не хапала сродкаў. Рэстаўрацыйныя работы аднавіліся тры гады таму: дайшла справа і да адраджэння славутасцяў малых гарадоў.

— Нарэшце мы дажылі да таго часу, калі можам аднаўляць свае помнікі архітэктуры, — гаворыць дырэктар Крычаўскага краязнаўчага музея Наталля Марозава. — Гісторыя — твар дзяржавы. Гэта вельмі важна.



ПАЛАЦ ЧАКАЕ МАЛАДЫХ

Палац Пацёмкіна — упрыгажэнне Крычава. Паводле планаў райвыканкама, у першым месяцы новага года тут урачыста адкрыецца зала шлюбаў, а пазней у палацы размесціцца раённы музей.

Звонку ўсе работы завершаны — шляхетныя светла-жоўтыя колеры, фасад з вежамі, элегантныя каванныя краты так званых французскіх балконаў.

Белыя дзверы цэнтральнага ўвахода ў палац нібыта ўжо гатовыя расчыніцца для крычаўскіх маладых. У ЗАГСе расстаўляюць новую мэблю: яна выраблена ў Бабруйску паводле эскізаў сталічнай фірмы і стылізавана пад даўніну. Паводле ідэі, увесь інтэр'ер палаца павінен нагадваць пра часіны свайго першага ўладальніка Рыгора Пацёмкіна.

ТУТ БЫЛА КАЦЯРЫНА ДРУГАЯ

Пацёмкін стаў валадаром Крычаўскага старостваства пасля перашла падзелу Рэчы Паспалітай, калі Кацярына Другая раздавала набліжаным землі. Для яго ў Крычаве быў пабудаваны палац паводле праекта рускага архітэктара Івана Стаўрова. Завяршэнне будоўлі, вельмі верагодна, было прымеркавана да візіту Кацярыны.

— Яна заязджала ў Крычаў у час сваёй вандроўкі на поўдзень у студзені 1787 года, — расказвае дырэктар раённага музея Наталля Марозава. — У апісанні вандроўкі сказана, што з Мсціслава 19 студзеня яна паехала ў Крычаў: быў дадзены абед і ўначы каля палаца гарэла ілюмінацыя. На наступны дзень імператрыца паехала далей. Верагодна, Кацярыну суправаджаў Пацёмкін. Гэта адзінае дакументальнае сведчанне таго, што Кацярына і Пацёмкін былі ў Крычаве. Ва ўсякім разе, аднойчы.

Пацёмкін прадаў свой маёнтак разам з палацам Івану Галынскаму. І менавіта род Галынскіх валодаў палацам да 1917 года.

— У сярэдзіне XIX стагоддзя ў Крычаве быў вялікі пажар, калі пагарэлі ўсе драўляныя пабудовы, — працягвае экскурс у гісторыю Наталля Марозава. — Быў пашкоджаны і палац. А ў цэнтры горада згарэў касцёл, пабудаваны яшчэ па волі польскай каралевы Боны. І тагачасны гаспадар маёнтка Вікенцій Галынскі дазволіў весці службы на першым паверсе палаца. І там жа ўступалі ў шлюб. Так што даволі сімвалічна, што цяпер у адноўленым палацы будзе ЗАГС і музей.

КРЫШТАЛЬ І ПАЗАЛОТА

Мармуровая лесвіца вядзе на другі паверх. У галоўнай зале палаца, дзе калісьці праходзілі ўрачыстыя прыёмы гасцей, мантажуюць люстру. Галоўная святільня важыць 37 кілаграмаў, яе неслі ўтраіх. Супрацоўнікі ЗАТ «Каскад» з горада Ліды расказваюць, што люстра мае каля 6 тысяч шатонаў (фрагментаў) са славацкага крышталю.

Светлавыя блікі адлюстроўваюцца на высокіх столях палаца і на пазалоце. Адразу ўсіх папярэджваюць: золата несапраўднае, не трэба дарма скабліць. А вось выгляд вельмі падобны: тэхналогія штучнай пазалоты такая ж, як у сапраўднага сусальнага золата.

У кожным квадраце паркета, якім выкладзены другі паверх, — 85 кавалкаў рознага колеру: ад чырвонага дрэва да алешыны. Квадратны метр такой прыгажосці каштуе прыкладна 600 долараў. Таму ў музеі для наведвальнікаў збіраюцца пашыць бахілы, каб цвёрдыя абцасы і брудныя падэшвы не сапсавалі дарагую палацавую падлогу.

СТАРАСВЕЦКІЯ ІНТЭР'ЕРЫ

У галоўнай зале палаца паставяць 60 паўкрэслаў у стылі XIX стагоддзя, павесяць партрэт Кацярыны Другой. Тут і цяпер будзе гарадская зала для ўрачыстасцяў.

Дзявочая, кухня, сталоўка, кабінет-бібліятэка, рыцарская і парадная залы, будуар, канапная і прыказчыцкая — у будучым усе гэтыя 9 пакояў можна будзе пабачыць у Пацёмкінскім палацы, з мэбляй і прадметамі побыту даўніх часоў. Яны дадуць уяўленне, як жылі людзі ў мінулых стагоддзях.

Праўда, частка мэблі будзе новай, але зробленай па чарцяжах XIX стагоддзя. Аднак у кожным пакоі павінна быць два-тры сапраўдныя прадметы. Зараз іх набыццём займаецца Магілёўскі абласны музей, і там нібыта ўжо нагледзелі ў прыватнай калекцыі буфет.

У самім Крычаўскім музеі ёсць толькі два крэслы, якія калісьці набылі за невялікія грошы яшчэ за савецкім часам у жыхара вёскі Дарлівая. Паводле звестак гаспадара, яны трапілі ў крычаўскую вёску ў рэвалюцыйны час. Крэслы будуць рэстаўравацца і зоймуць сваё месца ў Пацёмкінскім палацы.

МУЗЕЙ МАЦІ

Крычаўцы прыдумалі ў палацы, па суседстве з залай шлюбаў, зрабіць музей Маці — ён будзе першым у Беларусі.

Мастакі распрацавалі праект: вялікі абраз Божай Маці, выявы жанчын у старадаўніх нацыянальных строях і насупраць — нашы сучасніцы.

— Мы раскажам пра жанчын, якія былі абаронцамі і заступніцамі ў вайну, — абяцае Наталля Марозава. — Пра маці, сыны якіх загінулі ў Афганістане. Гэта сумная нота. Але не забудземся на простых працаўніц, якія гадуюць сёння сваіх дзяцей. І на жанчын, дзеці якіх выявілі сябе. Напрыклад, раскажам пра маці майго аднакласніка Аляксандра Брындзікава, які ў Расіі — першы намеснік міністра прамысловасці і тэхналогій.

У музеі Маці маладым, якія толькі што пажаніліся, будуць распавядаць пра ролю маці і пра сям'ю ўвогуле.

СІМВАЛ СТАРАЖЫТНАГА КРЫЧАВА

Крычаў упершыню ўзгадваецца ў гістарычных дакументах у 1136 годзе, але архітэктурных помнікаў таго часу зусім не засталося.

— У розныя часіны ў горадзе было шэсць-сем праваслаўных цэркваў, — узгадвае дырэктар музея. — Цудоўны касцёл знішчаны ў 1930-ыя гады. Былі яўрэйскія сінагогі. Але на сёння палац Пацёмкіна — адзіны ў горадзе архітэктурны помнік, які датуецца XVIII стагоддзем. І сёння Пацёмкінскі палац зэзе і чакае гасцей. Я ўпэўнена, што ён стане сімвалам нашага горада.

Гавораць, што ў кожным гістарычным будынку ёсць свае прывіды. Што датычыцца палаца ў Крычаве, то будаўнікі скардзіліся жартам, што нейкая загадкавая сіла абарочвала бутэлькі і слоікі. Але зданяў і таямнічых гукаў заўважана не было.

— Мы завядзём уласных прывідаў! — смяецца Наталля Марозава.

Ужо з вясны крычаўскія музейшчыкі рыхтуюцца да пераезду: перапісваюць і пакуюць усе каштоўныя экспанаты. У новым годзе пачнецца стварэнне новай экспазіцыі, і тэрміны тут будуць залежаць ад выдаткаваных сродкаў. А вось у асобнай выставачнай зале ўжо ў лютым плануецца наладзіць японскую выставу.

У музеі спадзяюцца, што ў Пацёмкінскім палацы — прыгожым і светлым — будзе шмат наведвальнікаў. Людзі ўжо запісваюцца на першую экскурсію. Мяркуецца, што Пацёмкінскі палац прыцягне ў Крычаў і турыстаў з іншых рэгіёнаў Беларусі. Яго плануюць уключыць у турыстычны маршрут, які цяпер пралягае праз Магілёў і Мсціслаў. І гэта будзе вельмі цікавая экскурсія ў гісторыю Крычава — старажытнага горада ва Усходняй Беларусі.

Ілона ІВАНОВА, *г. Крычаў*

Простыя рэчы

РУЛЯ

Васіль ПАНЧЭНЯ — жыхар вёскі Пагост Жыткавіцкага раёна. Ён любіць і працягвае промыслы сваіх продкаў–палешукоў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Не для таго, каб заінтрыгаваць чытача, назваў я гэты артыкул пра простыя рэчы словам, якое паўнапраўна жыве ў слоўніках беларускай мовы, не як састарэлае ці дыялектнае. Проста яно неяк забылася, выйшла з ужытку. Але мне вельмі падабаецца яшчэ з часоў, калі пачаў чытаць казкі, а потым аповеды пра родную гісторыю.

Дык руля — гэта дула, тое, без чаго не абыдзецца ніводны від агнястрэльнай зброі. Дакладней, гэта высвідраваная адтуліна ў ствале, дуле і сам ствол, дула. Дарэчы, слова ствол мае і іншыя значэнні. Напрыклад, ствол шахты, нервовы ствол, ствол дрэва. Ствол дрэва — ад каранёў да галля, кроны — раней у беларускай мове называўся яшчэ і галамень. Але размова пойдзе пра зброю.

Пасля вынаходніцтва ў Кітаі пораху, яго ў ваенных мэтах выкарыстоўвалі спачатку ў самых разнастайных відах гармат, а праз стагоддзі была прыдумана людзям на згубу і індывідуальная, стралковая зброя. І ва ўсіх яе сённяшніх праявах — вінтоўках, аўтаматах, пісталетах, кулямётах — руля-дула-ствол адыгрываюць вялікую ролю ў дальнасці стральбы, яе трапнасці.

Пазней гэта зброя атрымала і паляўнічае прызначэнне. Наколькі памятаю з крыніц, першымі паляўнічымі ружжамі былі пішчалі. Яшчэ ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя паляўнічае ружжо ў простых людзей на Беларусі было даволі рэдкай рэччу. Гэта паны бавіліся паляваннем. А просты чалавек найчасцей браў яго ў рукі, толькі калі, напрыклад, станавіўся на панскую службу, ішоў у леснікі. Міхал з «Новай зямлі» Якуба Коласа кожны дзень, ідучы ў лес, ускідваў на плячо стрэльбу. Але не сустракаюцца на старонках паэмы згадкі пра тое, што ён самастойна займаўся паляваннем. Вось паноў у час палявання даводзілася не раз абслугоўваць. Леснікі яшчэ называліся палясоўшчыкамі. У паэме сярэдзіны XIX стагоддзя менавіта палясоўшчыкам служыў у пана славуты Тарас, які пабываў на Парнасе.

А ж тут — лоп-лоп! — цераз дарогу,
Як быццам цецярук зляцеў.
Злажыўся стрэльбай — кляпсь! — не паліць,
Крамзель з другога! — не пякець!

І ўсё-такі ў беларуса, жыхара лясных гушчароў, бароў ды пералескаў, прага да паляванння была вялікая. А колькі паляўнічых гісторый расказвалася зімовымі вечарамі па хатах, дзе збіраліся гуртам мужчыны! Колькі іх увайшло ў літаратуру. А я прыгадаю гумар Янкі Брыля:

«Гусі, браце мой, напрадвесні селі на лузе. Дзікія. Эх, зарадзіў Аркадзій завар і папоўз. Думае... «Чым больш дам, птамаць, зарад, тым далей той шрот панясе, лепей, птамаць, дастане...» Добра, дурыла даў таго пораху, быў бязднымнага яшчэ. Поўз, поўз, заскерыўсё, прыцэліўсё і — цяў!.. Усяго таго, браце мой, завара к чорту парвала. І зубы яму апошнія ўшчэнт пакрышыла. Стралок! Крысціна Роўбіха потым пыталася: што ты там, Цімафей, такое здзелаў? Гэта, кажаш, не ты, а Бурак? Свісцела, свісцела, а потым равела, равела...»

Гэта ляцела, значыць, левая руля Аркадзевай стрэльбы, якую «парвала наўздоўж». Аж на суседні хутар, добры кіламетр».

Брыль нагадвае, што потым сустрэў ён таго Аркадзя і ўбачыў, што «зубы ў чалавека хораша ды бела адраслі».

У сацыяльных канфліктах, рэвалюцыйных паўстаннях XVIII, XIX, пачатку XX стагоддзяў і паляўнічая зброя станавілася баявой.

Пімен Панчанка:

Мне не будзе спакойна спаціа,
Я не выпушчу стрэльбу з рукі,
Пакуль ёсць паны у палацах,
Пакуль ёсць на зямлі жабракі.

У 20-х гадах XX стагоддзя, калі ішоў у нашай краіне працэс беларусізацыі, выдатны навуковец і грамадскі дзеяч Вацлаў Ластоўскі пачаў распрацоўку вайсковых камандаў па-беларуску. Гэта не знайшло запатрабавання тады, ды і сёння ўжо забыта. Але чыста з лінгвістычнага боку цікава. Прыязду толькі яго «Навытар са стрэльбай»: «Да бою рых-туй! На руку! Да на-гі! На пля-чо! Стрэльбу на чэсьць! Стрэльбу на рамо! Стрэльбы зьняць!»

Прыступаючы да тэмы ваеннай, вайсковай, адразу падумаў пра Васіля Быкава. Практычна ва ўсіх яго аповесцях зброя займае вялікае месца. І не проста як атрыбут вайны — значна больш, можна сказаць, зброя ажывае. Што ж прыгадаць? І тут прыйшло — «Сотнікаў». Аповесць не зусім мілітарная, яна больш пра існасць чалавека, пра тое, якія вялізныя зломы робіць у яго душы вайна. Але ёсць там і пра зброю. Галоўны герой аповесці, які апынуўся ў смяротнай небяспецы: «не расставаўся з вінтоўкай, якая дасталася яму выпадкова, але ўжо ў тым выпадку выратавала яго жыццё. Здарылася гэта ў восеньскім баі на раз'ездзе, які яны атакавалі ўсёй групай. Рэшта немцаў разбеглася, пакінуўшы машыны, але некалькі чалавек не паспелі ўцячы і схаваліся за штабелем шпал, адкуль адкрылі агонь з карабінаў. Ён упаў тады непадалёк ад насыпу, якраз на самым відавоку, і немцы пачалі біць па ім ледзь не ва ўпор. Адна куля прашыла яму шынелак на плячы, другая ўдарыла пад бок. Ён асыпаў штабель аўтаматнымі чэргамі са «шмайсера», але чэргі мала што маглі зрабіць немцам, укрытым радамі прасмаленых шпал. Праўда, ён у час зразумеў гэта і азірнуўся: непадалёк у канаве ляжаў з паніклаю галавой партызан, ля яго тырчаў з быльнягу ствол вінтоўкі. Сотнікаў задам адпоўз да канавы і пераўзброіўся. Варта было яму, добра прыцэліўшыся, выпусціць туды пяць куль, як нямецкі агонь спыніўся і партызаны пабеглі да будкі... Пасля ён убачыў за штабелем двух забітых эсэсаўцаў і наскрозь прабітыя яго кулямі шпалы, што і вырашыла ягоны выбар: «шмайсер» ён аддаў Мікулічу, а сабе ўзяў вінтоўку. Праз усю партызанскую зіму яна была яго вернай заступніцай і абаронцай. А цяпер, мабыць, дастанецца якому-небудзь п'яніцу-паліцаю, які будзе страляць у вёсках сабак ды збіваць каптуркі з каміноў. Вінтоўка была адзінае яго шкадаванне, іншыя ўсе перабалелі за страшныя месяцы вайны».

Напісанае некалі:

Мне сніцца стаў начамі кулямёт,
Што два гады плячо мне ў войску муліў.
І па мішэнях высланыя кулі
Ніяк не перапыняць свой палёт.

Магчыма, і вобразнае, але, па-праўдзе, недакладнае. Справа ў тым, што ў мотастралковай роце, у якой я служыў, была такая завядзёнка: за два гады службы салдат павінен быў змяніць і навучыцца валодаць трыма асноўнымі відамі тагачаснай стралковай зброі: аўтамат, кулямёт, гранатамёт. Так што кулямётчыкам я быў толькі нейкія паўгода, год насіў на плячы недаўгую трубу гранатамёта, паўгода быў старшым стралком з аўтаматам, старшым не таму, што кімсьці камандаваў, а таму, што да гэтага аўтамата дадаваўся спецыяльны прыбор начнога бачання, цяжкаватая штуковіна, якая надзявалася на аўтамат для стральбы ноччу, а так яе цягаў у спецыяльнай жалезнай скрынцы.

Стралялі мы вельмі шмат, боепрыпасаў не шкадавалі. Так што давялося моцна прывыкнуць да рукаятак зброі. За тыя два гады мы не тое што палюбілі яе, але павагай прасякнуліся глыбокай. Ведалі яе лепшыя і горшыя бакі, тое, як клалася яна на руку, якой «учэпістай» была. Якраз у час маёй службы ў арміі адбывалася пэўнае пераўзбраенне, наша паказальная дывізія першай перайшла з аўтамата Калашнікава 7,62 на аўтамат Калашнікава 5,45. Змяншэнне дыяметру кулі зрабіла яе больш бязлітаснай пры паражэнні, яна пачынала круціцца ў целе. Знакаміты канструктар Калашнікаў зрабіў зброю вельмі надзейнай. Яе не вельмі шанавалі. Часта проста клалі пад сябе, каб недзе прымасціцца адпачыць. Хапала і пылу, і снегу, і вільгаці — але служыла яна надзейна. Часта ў кінафільмах бачу, як на працягу бою салдат не мяняе магазіна ў аўтамаце. Гэта не так, выпусціць 30 патронаў можна адным націскам на спускавы кручок. А калі ў магазіне трасеры і страляеш ноччу, то атрымліваецца зусім непрацяглая чародка куль. Кулямёт Калашнікава — больш грозная зброя. Устанавіўшы яго на сошкі, можна было прыцэльна страляць на кіламетр. Да кулямёта дадаткова даваўся яшчэ адзін стволік. Мяняўся ён лёгка. А вось для чаго, я спачатку не разумеў. Аказваецца, у кулямёта каробка, дзе лента на сто патронаў, ды і дадатковыя каробкі ёсць. І калі весці інтэнсіўны агонь, стволік накаляецца, дальнасць і прыцэльнасць стральбы змяншаюцца. Вось і даводзіцца мяняць на запасны. Гранатамёт, РПГ-42, гэта з выгляду простая руля-труба са спускавым механізмам. Закладваеш туды гранату і страляеш па танку. Ёсць прыцэл механічны на самым гранатамёце, а ёсць аптычны (тады яны былі яшчэ сакрэтнымі), які прымацоўваецца да трубы. Гранатамёт ляжыць на плячы і выбух вельмі адчувальны. Нам дазвалялася нават скідваць каскі, каб не атрымліваўся эфект звана. Але аднойчы, калі за ноч давялося стрэліць адзінаццаць разоў, ішоў у казарму з палігона нібыта п'яны. У гранатамётчыка быў яшчэ дваццацізарадны пісталет Сцечкіна ў драўлянай кабуры, якая прылучалася да пісталета, як прыклад. Але патрапіць з яго ў цэль было вельмі цяжка.

Самае няўдзячнае — чысціць зброю. Калі гранатамёт-трубу — рабіць гэта проста. Ды і ў кулямёта стволік здымны, а вось аўтамат даводзілася грызці ледзь не зубамі, асабліва, калі расстраляеш з яго два-тры магазіны. А на першым годзе службы даводзілася чысціць яшчэ і зброю суседа-«дзеда».

І ўсё-такі да зброі так і не прызвычаіўся. Часам трапляў з сябрамі, знаёмымі на паляванне. Толькі страляць адмаўляўся, нават па пустых бутэльках. На афіцэрскіх зборах даводзілася рабіць гэта вымушана. Немілітарны зусім характар.

Дарэчы, успомнілася з біяграфіі маршала Жукава, які перад вайною доўгі час служыў у Беларусі, а ў вайну прымаў непасрэдны ўдзел у яе вызваленні. Нарадзіўся ён у вёсцы Стралкоўка. Былі, былі, відаць, нейкія карані ці, як цяпер кажуць, гены.

На экранах тэлевізараў цяпер вельмі шмат зброі. У тым ліку і снайперскіх вінтовак — вельмі небяспечнай і бязлітаснай рэчы. Гэта, па-мойму, не бой, а паляванне на чалавека, нездарма ж так любяць іх наёмныя забойцы. І тут успомнілася. У Пімена Панчанкі ёсць верш ваенных часоў, у якім ён пастараўся абмінуць крывавасць гэтай вайны. Ім і закончым:

У вока снайпера, нібы у дом прасторны,
Заходзяць дрэвы, хмары, вечар зорны
І лёгкі цень птушынага крыла
З разлёту дзеліць вока напалам.

Алесь КАСЦЕНЬ,
вёска Касцяні Пастаўскага раёна.

ПРЫПЫНАК, НЕБЯСПЕЧНЫ ДЛЯ ЖЫЦЦЯ

Адказны чыноўнік асуджаны за тое, што былі траўмаваны людзі, якія чакалі грамадскі транспарт на прыпынку. Грамадзяне стаялі на аўтобусным прыпынку ў Полацку. З-за парыву моцнага ветру ўпаў павільён. У выніку два чалавекі атрымалі цяжкія цялесныя пашкоджанні, іх жыццё было пад пагрозай. Трэці толькі па шчаслівай выпадковасці быў лёгка траўміраваны.

Была ўзбуджана крымінальная справа. У якасці абвінавачванага прыцягнулі да адказнасці дырэктара ЖКГ Полацка. Было ўстаноўлена, што ён не забяспечыў распрацоўку і зацвярджэнне ва ўстаноўленым парадку праектнай дакументацыі на будаўніцтва. Ён жа даў распараджэнне работніку ўстанавіць павільёны аўтобусных прыпынкаў. Чыноўнік не ажыццяўляў кантролю за выкананнем работ. Як паведаміла «Звязда» старшы памочнік пракурора Віцебскай вобласці Ірына Таўтын, прыгаворам суда адказная асоба была асуджана на 2 гады абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. З прадпрыемства на карысць пацярпелых было спагнана болей за 6 мільёнаў рублёў у якасці кампенсацыі матэрыяльнай і маральнай шкоды.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Агляд лістоў

«Звязда» мая...

Кажуць, для таго, каб удала склаўся год, патрэбна зусім нямшмат: дзень народзінаў адсвяткаваць правільна, так, як належыць. А належыць — ні многа, ні мала — 12 дзён прымаць... гасцей. Ці хоць бы іх віншаванні, пажаданні, падарункі.

Калі гэта і насамрэч, то перспектывы ў «Звязды» (прынамсі, на 91-ы год жыцця) самыя спрыяльныя! Ды і як інакш, калі з юбілеем газету віншуюць... дагэтуль.

«Нехта мудры сказаў: нішто так не ўскладняе чалавечае жыццё, як адсутнасць яснасці ў галаве, у душы, учынках. Магу дадаць — адсутнасць інфармацыі таксама», — чытаем у лісце сп. Харошка з в. Малішаў Хойніцкага раёна, якая выпісвае «Звязду» з 1952 года і любіць яе. А найперш — за «матэрыялы аб вечным — аб чалавечай прыстойнасці і дружбе, аб любові і вернасці. «Гэта найбольш адпавядае майму менталітэту, бо я — чалавек, які хваравіта перажывае здраду, не церпіць хлусні. За тое ж, — піша Галіна Нарцызаўна, — цаню і газету, якая амаль усе свае 90, нягледзячы ні на што, выходзіла і выходзіць на роднай мове, застаецца вернай сабе — вытрымманай, аргументаванай, праўдзівай...».

«Для таго, каб было зразумела, якое месца ў маім жыцці займае «Звязда», напішу, што адказы на ўсе свае пытанні я знаходзіў менавіта ў гэтай газеце, праз яе старонкі заўсёды віншаваў сваіх блізкіх, чытаў пра сябе, выйграваў 10 трубак шпалераў і нават тэлевізар «Віцязь», — піша ў рэдакцыю ветэран працы і Вялікай Айчыннай вайны мінчанін сп. Мазуркевіч.

Яшчэ адзін ліст —

НОВЫ ГОД СУСТРЭНЕМ 18 СНЕЖНЯ!

Безліч плюшавых, пластыкавых, гумавых грызуноў-сувеніраў, якія з'явіліся ў святочных аддзелах і секцыях побач з гірляндамі і мішурой, празрыста намякаюць на тое, што 2008 год прыйдзе да нас у вобразе Пацука. Што прынясе з сабой гэтая сімвалічная істота? Як найлепш падрыхтавацца да яе сустрэчы? Самае цікавае нашым чытачам раскрывае астролаг Кацярына ФЛІКОП.

— Пацук, як і ўсе астатнія грызуны, жывёла запаслівая. Натуральна, год Пацука будзе спрыяльным для працэсу назапашвання і паступовага росту ва ўсіх галінах чалавечай дзейнасці, у тым ліку і ў галінах інвестыцый, грашовых зберажэнняў, укладанняў. Увогуле, гэта добры год для паляпшэння матэрыяльнага стану. 2008-ы — год Зямнога Пацука, і стыхія Зямлі прынясе з сабой імкненне ўмацоўваць дабрабыт, жаданне атрымаць надзейнасць, стабільнасць як у працоўных справах, так і ў асабістых адносінах, упартасць у дасягненні сваіх мэтаў, пастаянства. Калі Свіння сімвалізавала поспех і актыўнае сацыяльнае дзеянне, то Пацук скіраваны на планамернае, без шырокага размаху, упорнае, пакрокавае прасоўванне наперад. Правільная стратэгія: зрабіць крок — спыніцца («захаваць», як гавораць камп'ютаршчыкі), прааналізаваць атрыманыя вынікі і толькі потым рушыць далей. Павольна, асцярожна, але няўхільна. Асобую ўвагу сёлета трэба звярнуць на пастаноўку сваіх стратэгічных мэтаў і задач (Пацук будзе спрыяць мэтанакіраваным асобам) — як глабальных, так і дробных, прамежкавых. Паводле легенды, калі Буда пачаў склікаць да сябе звяроў, Пацук прыбег першым і за гэта атрымаў права распачынаць 12-гадовы кітайскі астранамічны цыкл. Дакладна сфармулюйце: што вы хочаце атрымаць у бліжэйшыя 12 гадоў і як гэтага дасягнуць. Пацук дапаможа рэалізаваць многія вашы планы, нават тыя, якія вы не адзін год выношвалі ў галаве.

Пацук — істота сацыяльная, якая спрыяе актыўным сацыяльным узаемадзеянням. Таму сустракаць Новы год лепш у вясёлай кампаніі. Нават калі вы запланавалі адсвяткаваць яго ўдваіх са сваёй «палавінай», пасля бою курантаў варта выйсці на вуліцу, прагуляцца пад ёлкай, пабыць сярод людзей.

— Калі асобна вылучыць некаторыя аспекты нашага жыцця — кар'еру, дом, сям'ю, здароўе, як на іх адаб'ецца год Пацука?

— У першую чаргу год Зямнога Пацука — гэта год кар'ерных дасягненняў, што ўзмацняецца яшчэ і пераходам Юпітэра ў сузор'е Казярога. Казярог — зямны знак, і, як і Пацук (нягледзячы на яго сацыяльнае ўзаемадзеянне) у першую чаргу скіроўвае чалавека на самарэалізацыю, прафесійнае самаўдасканаленне. Што датычыцца кахання і асабістага жыцця, год абяцае быць стабільным і спакойным (хоць, безумоўна, жыццё непрадказальнае). Можна смела планаваць пашырэнне сям'і, заводзіць дзяцей. Для заключэння шлюбаў год таксама даволі ўдалы. Праўда, рамантычныя ўздохі пад Месяцам і клятвы тыпу «каханая, я падару табе зорку!» сёлета будуць неактуальныя. Лепш падысці да справы прагматычна: заяву ў ЗАГС пададзім заўтра, вяселле прызначым на такую дату, запросім столькі чалавек...

Усе грызуны, і пацукі таксама, шмат часу надзяляюць добраўпарадкаванню свайго жытла, таму ў 2008 годзе можна смела браць з іх прыклад: будаваць (набываць) кватэру, рабіць рамонт, перастаноўку, абзаводзіцца бытавой тэхнікай ці проста ўпрыгожваць месца, дзе вы жывяце. Аднак найперш неабходна ўсё дасканала прадумаць, Пацук не любіць няўзважаных рашэнняў.

Калі гаварыць пра небяспеку для здароўя, у Казярога слабыя суставы (асабліва каленныя) і ўся апорна-рухальная сістэма, зубы, пазногці. На гэта сёлета варта звярнуць асаблівую ўвагу.

— Год таму мы гаварылі, што Юпітэр пераходзіў у сузор'е Стральца (менавіта з гэтага моманту і пачынаўся новы астранамічны год паводле заходняй традыцыі). Цяпер вы сказалі, што Юпітэр перамяшчаецца ў сузор'е Казярога. Калі гэта адбудзецца?

— Вечарам 18 снежня. Юпітэр прабудзе там да 5 студзеня 2009 года. Нагадаю, многія астролагі 12-гадовы цыкл абарачэння Юпітэра вакол Сонца суадносяць з 12-гадовым Усходнім календаром (за год Юпітэр праходзіць праз адзін знак задыяка). І нездарма. Яшчэ 2—4 тысячы гадоў таму гэтыя цыклы супадалі. Зараз яны змясціліся, аднак падабенства характарыстык абодвух цыклаў прымушае гаварыць аб іх астралагічнай узаемасувязі. Году Пацука, паводле Усходняга календара, адпавядае год знаходжання Юпітэра ў сузор'і Казярога. Юпітэр у Казярогу будзе падтрымліваць тыя ж якасці, што і Пацук: дапамагаць канцэнтравацца на першарадных задачах, у самарэалізацыі і прасоўванні па кар'ернай лесвіцы.

— А калі надыдзе Новы год паводле Кітайскага календара?

— Гэта заўсёды здараецца на другі маладзік пасля зімовага сонцастаяння. Сёлета гэтая падзея прыпадае на 7 лютага, калі дакладней — на 5 гадзін 44 хвіліны раніцы па мясцовым часе. Прычым пачатак кітайскага Новага года супадзе з сонечным зацьменнем. Такое супадзенне здараецца выключна рэдка і гэты факт сам па сабе можа лічыцца знакам. Зацьменне (сонечнае і месяцовае) здаўна ўспрымалася як з'ява небяспечная. З пункту гледжання астралогіі, з зацьменнямі звязаны сітуацыі, якіх нельга пазбегнуць і якія немагчыма змяніць. Калі месяцовыя зацьменні больш датычацца «чалавечай» (зямной) прыроды, то сонечныя ўздзейнічаюць на нашу духоўнасць. У такія перыяды людзі могуць страціць унутраныя арыенціры, праявіць не лепшыя свае якасці і ў выніку змяніць свой лёс у горшы бок. Каб гэтага не здарылася, падчас сустрэчы кітайскага Новага года раю ўсім захоўваць духоўную пільнасць, пазбягаць спакус, каб не звярнуць з правільнага шляху. У год здараецца два сонечныя і два месяцовыя зацьменні. Сёлета сонечныя адбудуцца 7 лютага і 1 жніўня, месяцовыя — 21 лютага і 16 жніўня.

— Многіх непакоіць той факт, што 2008 год — высакосны, а значыць, небяспечны для заключэння шлюбаў, утварэння фірмаў, распачынання новых спраў і г.д.

— Ёсць такая народная прымаўка: ідзе Касьян касой касіць. Высакосны год вызначаецца павышанай колькасцю непрадказальных сітуацый, прыродных фактараў. Будаваць планы ў гэты год можна, паскорыць іх рэалізоўваць — таксама. Толькі трэба ўлічваць, што з-за павышанай стыхійнасці жыццёвых праяў нешта можа рэалізавацца не зусім так, як вам хацелася б.

— Некаторыя астролагі ў сваіх прагнозах асобна вылучаюць планету Сатурн. У чым яе адметнасць?

— Сатурн у адным знаку задыяка праводзіць 2—3 гады. 2 верасня гэтага года ён перайшоў у сузор'е Дзевы, дзе прабудзе да 29 кастрычніка 2009 года. Калі Юпітэр — планета поспеху, удачы, сацыяльнага праяўлення, то Сатурн — планета кармічных лёсавызначальных момантаў, яе яшчэ называюць нябесным выхавальнікам. Сатурн — планета Казярога, а значыць, будзе ўзмацняць яго асноўныя якасці, пра якія мы гаварылі вышэй. Дзева, як і Казярог, — зямны знак і ўплыў стыхіі Зямлі ў гэты перыяд будзе вельмі адчувальным. Казярог — гэта Зямля ў дзеянні, а Дзева — аналітык і мысліцель. Адсюль вынікае, што перад тым, як узяцца за рэалізацыю любога свайго плана, неабходна ўсё прааналізаваць, інакш сітуацыя будзе выходзіць з-пад кантролю. Дзева — знак бясконцага самаўдасканалення, таму да канца кастрычніка 2009 года будзе асабліва актуальным навучанне, асваенне новага. Акрамя таго, Дзева спрыяе здароваму ладу жыцця, рацыянальнаму харчаванню, адмаўленню ад шкодных звычак. Такім чынам, у бліжэйшыя 2,5 года кінуць смаліць ці сесці на дыету нам будзе значна лягчэй, чым у нейкі іншы перыяд.

СПРЫЯЛЬНЫЯ ПЕРЫЯДЫ 2008 ГОДА: з 16 сакавіка па 3 чэрвеня — час рэалізацыі маштабных дзелавых і творчых праектаў, актыўнай сацыяльнай дзейнасці, пошуку і змены месца працы, падарожжаў, атрымання новых ведаў. Гэта лепшы перыяд для вынаходніцтваў і людзей творчых прафесій. Верагодна нечаканае з'яўленне новых магчымасцяў і прапаноў. А вось **з 17 па 25 студзеня** і **з 12 па 29 лістапада** нас чакае вельмі добры час для планавання і пачатку паступовай рэалізацыі сваіх ідэй, даўніх задум. У гэты перыяд лепш за ўсё пашыраць кола сваёй працоўнай дзейнасці, упэўнена і прадумана развіваць сваю справу.

НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ПЕРЫЯДЫ 2008 ГОДА: з 28 студзеня па 19 лютага, **з 26 мая па 19 чэрвеня**, **з 24 верасня па 15 кастрычніка** — перыяды рэтраграднага Меркурыя, планеты, якая адказвае за зносіны і сродкі камунікацыі. У гэтыя перыяды верагодны зрывы запланаваных сустрэч, здзелак і дзелавых перамоў, парушэнні ў рабоце транспарту, аргтэхнікі, сродкаў мабільнай і электроннай сувязі. Лепш не прызначаць на гэты час адказных дзелавых сустрэч, не падпісваць кантрактаў, не мяняць месца працы, не рабіць буйных пакупак. Вельмі ўважліва правяраць любую атрыманую інфармацыю. 9 мая — 8 верасня — перыяд рэтраграднага Юпітэра. Трэба быць вельмі абачлівым у самаадценцы, стрымліваць залішнюю даверлівасць і самаўпэўненасць. Спрыяльны час для вандровак. З **канца снежня 2007 да 3 мая 2008** — перыяд рэтраграднага Сатурна, калі людзі будуць схільныя паглыбляцца ў свае негатыўныя перажыванні, успаміны, «гнабіць» сябе. Якраз гэтага рабіць і не варта. Неабходна больш бываць у калектыве, не засяроджвацца на ўнутраных праблемах, а галоўнае — не рабіць высноў на перспектывы. Гэты час трэба проста перажыць. Падобныя настроі будуць панаваць і ў перыяды **з 7 студзеня па 2 лютага**, **з 11 па 28 кастрычніка**. Яшчэ адзін небяспечны перыяд: **з 28 верасня па 11 кастрычніка**. Сітуацыя будзе спакушаць змяніць жыццё, аднак у гэты час якраз нічога прадпрымаць не варта.

— Каб не заблытацца ў шматлікіх нюансах ўзаемнага ўплыву планет і сузор'яў, давайце яшчэ раз пералічым самыя важныя моманты надыходзячага года.

— Гэта паступовае, няспешнае паляпшэнне дабрабыту і ўвогуле становішча вырашэнне многіх матэрыяльных пытанняў; праверка на практычнасць нашых праектаў і планаў; кар'ерны рост; уменне канцэнтравацца на галоўным. Вельмі важна ў год Пацука правільна сфармуляваць свае мэты і шляхі іх дасягнення. І не баяцца дзейнічаць. «Мінусамі» Дзевы і Казярога можна назваць залішнюю асцярожнасць і кансерватызм. Сёлета людзям будзе больш складана нешта змяніць у сваім жыцці, хоць па вялікім рахунку год падыходзіць для перамен, проста іх трэба рабіць прадумана. Яшчэ варта пазбягаць празмернай канцэнтрацыі, «зацыкленасці», інакш любая мэта адразу стане недасягальнай.

— Як астролагі раяць сустракаць год Пацука?

— 2008 год лічыцца годам Зямлянога Пацука, таму ў адзенні лепш выкарыстаць жоўты, шэры, прыглушаны карычневы, тэракотавы. З металу лепш абраць жоўты (золата). Лічыцца, што серабро будзе нагадваць Пацуку пасткі, капканы і іншыя непрыемныя рэчы. У аздабленні пакоя таксама лепш прытрымлівацца цёплай «земляной» і «мышынай» гамы. Каб парадаваць Пацука, не забудзьцеся паставіць на святочны стол арэхі, прадукты са збожжавых культур, сыр, семкі, рыс, кукурузу. Пацукі — вандроўнікі, таму добра будзе сустрэць Новы год у гасцях, у паездцы. Старажытнакітайскае вучэнне фэн-шуй раіць для прыцягнення ў хату станоўчай энергіі і ўдачы пакласці выяву пацука ў паўднёва-усходнім кутку кватэры. Напярэдадні Новага года можна набыць сабе хамячка, пацука, мышку, альбо проста пакласці на падлогу сімвалічны пачастунак для грызуноў.

— А што лепш падарыць на Новы год?

— Тут меркаванні падзяліліся. Адны раяць прытрымлівацца традыцыі і дарыць усё, што мае выяву пацука ці мышы (сувеніры, цацкі, бірулькі і г.д.). Іншыя звяртаюць увагу на тое, што Пацук — прагматык, таму раяць адкласці ў бок плюшавую цацку, а падарыць — каструлю ці іншую, неабходную ў гаспадарцы рэч.

— Непасрэдна ў навагоднюю ноч, калі б'юць куранты, прынята загадваць жаданне. Аднак паводле заходняй еўрапейскай традыцыі новы год наступіць 18 снежня, па кітайскім календары — 7 лютага, а мы прывыклі сустракаць яго з 31 снежня на 1 студзеня. Калі ж загадаць жаданне, каб не памыліцца?

— Пачынаючы з 18 снежня можна падводзіць вынікі дасягнутага, фармуляваць свае мэты на бліжэйшую і далёкую перспектывы, будаваць планы іх рэалізацыі. У навагоднюю ноч з 31 снежня на 1 студзеня пад бой курантаў варта дакладна прагаварыць іх (услых ці пра сябе). Мільёны людзей у гэты момант канцэнтруюць сваю ўвагу на сустрэчы Новага года, звязваюць з ім надыход новых добрых падзей. Пры гэтым адбываецца велізарны выплеск станоўчай энергіі, чалавечых спадзяванняў і надзей, таму вельмі важна сустрэць Новы год з адпаведным псіхаэмацыянальным настроем. З гэтай нагоды жадаю ўсім знайсці для сябе цікавую мэту і з урачыстым настроем сустрэць Новы год.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.11	15.49	7.38
Віцебск —	8.08	15.32	7.24
Магілёў —	8.01	15.40	7.39
Гомель —	7.50	15.44	7.54
Гродна —	8.25	16.06	7.41
Брэст —	8.17	16.14	7.57

Месяц

Маладзік 9 снежня.
Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Аляксанра, Аляксея, Барыса, Макара, Мітрафана, Рыгора, Фёдара;*
К. *Леанціны, Емяльяна, Здіслава, Зянона, Мікалая.*

НАДВОР'Е на заўтра



— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

Геамагнітныя ўзрушэнні

2 гадз. | 5 гадз. | 8 гадз. | 11 гадз. | 14 гадз. | 17 гадз. | 20 гадз. | 23 гадз.

...у суседзяў

ВАРШАВА	КІЕЎ	РЫГА
+5..+7°С	+1..+3°С	+4..+6°С
ВІЛЬНЮС	МАСКВА	С.-ПЕЦЯРБУРГ
+2..+4°С	-1..+1°С	-1..+1°С

Дзве даты

6 снежня

1902 год — створана першая беларуская нацыянальна-дэмакратычная партыя сацыялістычнага накірунку Беларуская сацыялістычная Грамада (БСГ). Спачатку мела назву Беларуская рэвалюцыйная Грамада. Канчаткова аформілася як партыя ў снежні 1903 года на І з'ездзе ў Вільні. Сярод асноўных пунктаў праграмы: нацыянальная аўтаномія, муніцыпалізацыя зямлі. Мела арганізацыі ў Маскве, Пецярбургу, Кіеве, Сараташе, Казані, Хельсінкі і іншых гарадах. Актыўнымі членамі партыі былі Алаіза Пашкевіч (Цётка), І. і А. Луцкевічы, К. Кастравіцкі (Карусь Каганец) і інш.



1240 год — хан Батый захапіў горад Кіеў, выразаўшы ўсё насельніцтва горада.

Цытата дня:

Ёсць дзве аднолькава зручныя пазіцыі: або верыць ва ўсё, або ва ўсім сумнявацца. І тое, і другое пазбаўляе ад неабходнасці думаць».

Жуль Анры Пуанкарэ (1854—1912), французскі матэматык, фізік, філосаф.

Усміхнёмся!

Боўлінг — небяспечная гульня. Напіваешся, і пры гэтым упэўнены ў тым, што займаешся спортам...

☺

Выпіваюць мужыкі. Адзін другому скардзіцца:

— Калі прыходжу дадому нецвярозым, жонка качалкай б'ецца!

Другі:

— А ты каструлю на галаву надзень!

На наступны раз той, які даў параду, пытаецца:

— Ну як, паспрабаваў?

— Так, выдатна! Уяўляеш сабе, жонка ў гэтай каструлі нічога не бачыць!

☺

За час нясення службы ахоўнік супермаркета Іваноў папярэдзіў тры сквапныя позіркі ў бок касы і восем задумлівых.

☺

Настаўніца пытаецца ў вучня:

— Ты чаму спазніўся?

— Па дарозе ў школу на мяне напалі зладзеі і абрабавалі!

— І што ж яны ў цябе ўзялі?

— Сшытак з хатнім заданнем!

☺

Ён і яна.

— Ты мне здраджваеш?

— Табе — не. Юльцы з другога паверха — здраджваю.

Шчыра віншуем з юбілеем дарагога сына і брата **Станіслава Альфрэдавіча УЛАСЕВІЧА** з в. Карповічы.

Хай кожны год — як колас жыта,
Заўсёды радасны, багаты.
А кожны дзень, табой пражыты,
Каб падарункам быў і святам.

Мама, сястра.

Тусоўка

ПРЫГОЖЫХ І ПАСПЯХОВЫХ МІНЧАН ПЕРАЛІЧЫЛІ

Як і летась, атрымалася 50

На пачатку зімы фінішаваў праект Святочнага бюро Ларысы Грыбалёвай «Топ-50 прыгожых і паспяховых людзей Мінска-2007». Сёлета «пералік» адбыўся ўжо ў другі раз, але дзейнічаў прыкладна па тых жа ўмовах. За адным выключэннем: сваю кандыдатуру намінанты маглі прапаноўваць самі, не чакаючы, пакуль іхнія дасягненні і прыгажосць заўважаць навакольныя — у сэнсе, эксперты. У выніку адной смелай жанчыне — бізнэс-лэдзі Святлане Бякешчанка — удалося-такі трапіць у спіс 50 лаўрэатаў, астатніх кандыдатаў узгадняла журы, членаў якога было ўсяго напалову менш, чым «топавых» асобаў.

Канчатковы варыянт «Топ-50» агучылі падчас цырымоніі ўзнагароджання прадзюсар ідэі Ларыса Грыбалёва і спецыяльна выпісаны з Масквы сувядучы Іван Ургант. Заўважым, дзеля таго, каб стаць сведкамі і ўдзельнікамі падзеі, свецкім асобам і бізнэс-эліце давялося ехаць... на Ждановічы. Менавіта тут размясціўся абраны арганізатарамі начны клуб — што, відаць, павінна было засведчыць дэмакратычнасць мерапрыемства і блізкасць да народа. Сапраўды, куды ўжо бліжэй — хіба што ў саміх палатках на рынку.

Пераважную колькасць прыгожых і паспяховых кандыдатаў вылучалі члены журы — можна толькі здагадвацца, па якіх крытэрыях. Злыя языкі, праўда, сцвярджаюць, што тут і здагадвацца не трэба: кожны хваліў сваё балота. Прабачце, заўважных асобаў са сваёй сферы. Тэлевізійнікі прапаноўвалі вядучых, артысты — артыстаў, дызайнеры і прадстаўнікі мадэльных агенцтваў — мадэляў, фатографы — фатографаў. У выніку топ атрымаўся досыць прадказальны: скажам, летась у яго ўваходзілі Макс Мірны, Віка Азаранка і Руслан Салей — сёлета Аня Шарэвіч, Аляксандр Глеб і Міхаіл Захараў. «Гламурную» тэлевядучую Люсю Лушчык замяніла не менш гламурная журналістка Раіса Мурашкіна. Рэзідэнта «Камедзі Клаб» Вадзіма Галыгіна — рэзідэнт «Камедзі Клаб» Яўген Булка. Пластычнага хірурга Дзмітрыя Бацюкова — пластычны хірург Віктар Серабро. У цэлым суадносіны засталіся паліткарэктнымі: частка спартсменаў, частка стылістаў-візажыстаў, частка людзей мастацтва — акцёраў, спевакоў, музыкантаў, мастакоў і фотографаў, крыху тэлевядучых, мадэляў, бізнэсменаў, прадстаўнікоў ІТ-галіны, кіраўнікоў рэстаранаў, прадстаўнікоў буйных гандлёвых марак. Калі выходзіць са спісу «Топ-50», цяжка стаць паспяховым, напрыклад, у сферы радыё, літаратуры, турбізнэсу, вайсковай справы і г.д. Сярод лаўрэатаў няма ніводнага настаўніка (тэлевізійная слава віцябчаніна Паўла Кежы відавочна забытая) і ніводнага палітыка ці чыноўніка з дзяржструктур (ведамасная праца накладвае нязмыўны адбітак, ці што?).

Затое ёсць у «Топ-50» забаўныя моманты. Скажам, Мікалай Мірны ўвайшоў у спіс прыгожых ды паспяховых як «самы выбітны бацька і трэнер Беларусі»; не хлушу, так і ў дыпломе напісана. Гэтаксама ў спісе, відаць, па гарачых слядах кінафестывалю «Лістапад», знакадзяцца адразу тры акцёры — Вера Палякова, Анатоль Кацянёў і Анатоль Кот. І нікога не засмучае, што апошняга ўжо даўно з малой доляй верагоднасці можна называць мінчанінам — дый на цырымонію ён не прыбыў, аддаўшы перавагу працы. Зрэшты, што Кот — у лаўрэаты трапіла нават «экспартная» беларуска Алёна Свірыдава, якая, натуральна, прыімчацца атрымліваць дыплом таксама не сабралася, гэтаксама як спявачка Б'янка, якую нарэшце ацаніліў на радзіме. Не было на цырымоніі і прадстаўнікоў Дзмітрыя Калдуна, хоць ён сам прызджае ў Мінск даволі часта. (Спытаеце, чаму ў «Топ-50» трапіў менавіта ён, а не старэйшы брат? Можа, арганізатары вырашылі, што хопіць ім на сям'ю і адной квоты — а можа, улічваючы вопыт сям'і Мірных, Георгію Калдуну трэба яшчэ год пачакаць).

Невядома, дарэчы, каму пашанцавала больш — тым, хто на цырымонію трапіў, або ўсё ж тым, хто не даехаў. Лаўрэаты за ўсю сваю прыгажосць ды паспяховасць атрымлівалі не якую-небудзь там адмысловую статуэтку на сподачку з залатой каёмачкай, а ўсяго толькі дыплом і шэраг ільгот на наведванне розных устаноў Мінска. Адным з бонусаў, напрыклад, стала зніжка ў 50 еўра на рэйс Аўстрыйскіх авіялініі. Як не запаволіў саркастычна заўважыць Іван Ургант, калі ўзнагароджаныя скінуцца, аднаму з іх удасца-такі праляцець бясплатна.

Адзінае, чым маглі сябе заняць прысутныя, акрамя вывучэння купонаў — гэта разглядаць «жывыя карціны». Па зале перамяшчаліся некалькі дзяўчат, целы якіх упрыгожвалі фрагменты карцін Сальвадора Далі (менавіта ў гэтай стылістыцы была аформлена ўся вечарынка). Прыгожаму полу — чаго мы там не бачылі, як кажуць — прапанавалася заняць сябе, пазіруючы ў спецыяльна адведзеным кутку перад прафесійнымі фатографамі. Акрамя таго, частка творчых лаўрэатаў парадавала публіку сваімі выступленнямі; а тыя, хто дацярпеў да салодкага, яго і пакаштавалі — цырымонія завяршылася разразанням і раздачай торту ў выглядзе дыплома «Топ-50».

Ліна МАЛІНІНА.

ПРАГНОЗ НА 2008 ГОД:

Авенам сёлета варта сканцэнтравацца на самым галоўным у сваім жыцці і не намагацца вырашыць важныя справы адным махам. **Цяльцам** удача будзе спрыяць у кар'еры, калі яны будуць дакладна ведаць, чаго яны хочуць. Добры час для кахання. **Блізнятаў** чакае непрадказальны і насычаны падзеямі год. Галоўнае — не займацца некалькімі справамі адначасова. **Ракам** давядзецца лавіраваць паміж працай і сям'ёй. Вам дапаможа ўменне планаваць. **Львам** год прынясе шмат нечаканасцяў. Праявіце максімум упартасці і працалюбства, будзьце ўпэўненымі ў сабе і тады вашы намаганні ў рабоце і каханні акупяцца. **Дзеву** чакае вельмі паспяховы год. Яна зможа рэалізаваць свае ідэі і планы як у кар'еры, так і ў адносінах з блізкімі людзьмі. **Шалям** неабходна быць больш мэтанакіраванымі і рашучымі, каб не ўпусціць новыя магчымасці. **Скарпіёнам** варта паставіць доўгатэрміновыя мэты і няспешна да іх ісці. Для **Стральцоў** 2008 год — час рэалізацыі перспектыўных планаў, узаемавыгаднага супрацоўніцтва і адказнасці ў каханні. Вельмі ўдалы год для **Казярогаў**, самадысцыпліна і арганізаванасць прынясуць поспех ва ўсіх галінах. **Вадалеям** варта быць больш адказнымі і надзейнымі, каб рэалізаваць свае планы. Час закладаць трывалы падмурак сваёй будучыні. **Рыбам** год прынясе новыя перспектывы. Добры час для ўмацавання асабістых адносінаў.

Для **Пацука** вельмі ўдалы год. Пацук можа проста звярнуць горы. Перад **Быком** будуць адчыненыя многія дзверы. Не ўпусціце свой шанц! Для **Тыграў** год спрыяльны, але «павольны», каб нечага дасягнуць, Тыгру неабходна будзе прыкласці больш намаганняў. **Кату** захочацца ўсяго і адразу, таму ён будзе гатовы да любых рызыкоўных дзеянняў, але яму лепш больш працаваць, а не рызыкаваць. У **Драконаў** усё будзе атрымлівацца з мінімумам намаганняў (і ў кар'еры, і ў каханні). **Змеям** варта быць гатовымі да новых магчымасцяў і скіраваць іх у правільнае рэчышча. **Каню** трэба быць асцярожным, каб не згубіць сябе ў чужых справах і планах. **Казе** год прынясе шмат нечаканых перамен, але баяцца іх не трэба, усе да лепшага. Добры год для **Малпы**. Варта не ўпусціць новыя магчымасці. **Пеўням** астролагі раяць упарта працаваць і быць гатовымі дапамагчы акаляючым. **Сабаку** трэба быць сканцэнтраваным. **Свінні** варта працягваць распачатыя год таму справы.

Гутарыла Інга МІНДАЛЁВА.

Прысвячаецца... мышам, а аўтарам — «звяздоўскія» падарункі

Віцебскі філіял РУП «Белпошта» праводзіць конкурс дзіцячага малюнка з казачнай назвай «Мышкін новы год».

Як паведаміла «Звяздзе» начальнік аддзела маркетынгу гэтай установы Вікторыя Карэліна, тэма конкурсу, вядома ж, тлумачыцца сімвалам наступнага года. Акрамя Віцебска, конкурс праводзіцца ў Оршы, Глыбокім, Дуброўне, Докшыцах, Міёрах, Полацку і іншых раённых цэнтрах (усяго ў 11 рэгіёнах). У цэнтральных аддзяленнях паштовай сувязі адкрыты выставы малюнкаў.

У конкурсе бяруць удзел хлопчыкі і дзяўчынкі ва ўзросце ад 4 да 15 гадоў. Адзіная ўмова арганізатараў: трэба было адправіць малюнкі ў заказных лістах. Цікава, што сярод рэгіёнаў найбольш актыўны Сенненскі: прапанаваны на конкурс творы 195 дзяцей. Дарэчы, нават юныя мінчане пажадалі пазмагацца за перамогу. Вікторыя Пятроўна падкрэсліла, што праект ажыццяўляецца пры падтрымцы гарадскіх і раённых аддзелаў адукацыі, а генеральным партнёрам стала кампанія МТС...

На малюнках можна ўбачыць мыш у космасе, на свяце, мышкараля і інш. Асабіста на мой погляд, безумоўна, заслугоўвае ўзнагароды 14-гадовая віцябчанка Вікторыя Воранава, якая напісала прыгожы верш, прысвечаны акцыі, які надрукаваны на рэкламнай лістоўцы конкурсу.

Між іншым, самыя лепшыя «мышыныя творы» потым з'явяцца на паштовых канвертах. Дзеля гэтага з кожнага рэгіёна адбяруць, на погляд журы, найлепшыя 3 работы. Вынікі конкурсу падвядуць 7—8 снежня. Мяккія цацкі (безумоўна, мышэй) атрымаюць найбольш таленавітыя аўтары. «Звязда» таксама з вялікім задавальненнем перадала фірмовыя прызы для пераможцаў конкурсу.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА.

ВЫНІКІ ТЭМАТЫЧНАГА КОНКУРСУ СКЛАДАННЯ «ЗВЯЗДА»-90

На юбілейны тэматычны конкурс складання трохходавак «ЗВЯЗДА»-90 паступіла нямнога задач — толькі восем ад пяці аўтараў. Мусіць невялікая колькасць выклікана была складанасцю тэмы. А яна гучала так: «На полі «А» знаходзіцца белая фігура (але не пешка), якая робіць першы ход; пасля яе ўходу на гэтым полі павінен праходзіць мат у пагрозе і маты ў варыянтах (не меней за тры) рашэння».

На жаль, на конкурс паступілі слабыя задачы; аўтары не змаглі справіцца з многімі цяжкасцямі, а шлях жа да поспеху цярністы! Павінна быць старанная праверка ўсіх магчымасцяў гульні ў задачы — адна з тэхнічных дэталяў (і вельмі важная!), а для гэтага патрабуецца вялікі вопыт.

Суддзя конкурсу адзначыў толькі дзве задачы — Віктара БЫКАВА і Віктара ВОЛЧАКА.

Прыводзім гэтыя задачы.

Віктар Волчак (Лідскі раён). Ганаровы водгук. Мат за 3 хады (7+8).



Рашэнне. 1. Cf4 ~~ 2. e4+ Kpd4 3. Ce3x; 2. ... fe 3. Лd6x; 1. ... Kpd4 2. Kpd6 bc 3. Ce3x; 2. K:f4 3. e3x; 1. ... bc 2. dc ~~ 3. Ke3x; 1. K:f4 2. Лd6+ Kpe4 3. Лe3x.



Віктар Быкаў (Мінск). Ганаровы водгук. Мат за 3 хады (10 +10).

Рашэнне. 1. Лd6! ~~ 2. Лc4+ bc 3. d4x; 1. ... K:d6 2. Cb6+ Kpd5 3. Лd4x; 1. ... K:d3 2. Ke4+ Kpc4 3. Лd4x; 1. ... ba 2. Лc4+ Kpb5 3. Kd4x.

У абедзвюх задачах выкарыстаны адзін і той жа механізм. Суддзя хацеў бачыць задачы з правільнымі матамі, а прапанаваны аўтарамі задач механізм без правільных матаў быў распрацаваны шмат разоў. Ёсць ён і ў задачы Рычкова з конкурсу газеты «Чырвоны гірнік» 1991 года.

Масавы конкурс рашэнняў

Заданне № 9. Мат за 3 хады (7+1).



Заданне № 10. Мат за 3 хады. (6+5).



Час на рашэнне — два тыдні з дня апублікавання заданняў.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

html: www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.132. Індэкс 63850. Зак. № 6646. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П